Саўгасы павінны неадкладна ліквідаваць адставаньне ў сяўбе азімых

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 252 (4157)
СЕРАДА, 16 верасьня
1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Камплектаваньне стада— на ўдарныя тэмпы

«У 1931 г. павінен быць закладзен цьвёрды фундамант для далейшага шпаркага разгортваньня сацыялістычнага сэктару жывёлагадоўлі».

Такава дырэктыва партыі і ўраду, дадная ў гістарычнай адозьве ЦК УсеК(б) і СНК СССР аб разгортваньні жывёлагадоўлі. Партыя вызначыла асноўныя шляхі, па якіх павінна ісьці далейшае разьвіцьцё буйной апрамаджанай таварнай жывёлагадоўчай гаспадаркі—шляхі максымальнага фарсаваньня будаўніцтва ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАЎ І КАЛГАСНЫХ ТАВАРНЫХ ФЭРМ.

БССР зьяўляецца адным з асноўных жывёлагадоўчых раёнаў Савецкага Саюзу. Размах разьвіцьця жывёлагадоўлі можна бачыць хаця-б з таго, што, паводле апошняй пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР да канца 1931 г. пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў БССР павінна быць даведзена да 1.942 тыс. галоў, у тым ліку 1.200 тыс. кароў, пагалоўе сьвіней да 2.710 тыс., у тым ліку 887 тыс. сьвіноматак.

З моманту апублікаваньня адозвы ЦК і СНК ужо прайшло паўтара месяца—тэрмін зусім выстарчальны для таго, каб праверыць як выконваецца цэнтральная задача, пастаўленая зараз партыяй у галіне сельскай гаспадаркі.

Камплектаваньне стада жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм на сёньшні дзень праходзіць у БССР нездавальняюча.

У саўгасах Сьвінаводу камплектаваньне стада павінна быць закончана да 1-га кастрычніка. Адназ, тэмпы камплектаваньня, якія мы маем зараз, не гарантуюць выкананьня пляну ў тэрмін. На 10-га верасьня плян камплектаваньня ў саўгасах Сьвінаводу быў выканан на 58,7 проц. На працягу трох дзнёў, якія засталіся, неабходна паставіць у саўгасы яшчэ 16.000 сьвінаматак. Тэрмін зусім абмежаваны і патрабуе сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў.

Між тым, у радзе саўгасаў мы яшчэ наглядаем зусім недапушчальныя адносіны да пытаньняў фармаваньня стада. Так, у саўгасах «БЕЛЕНЬ», «ШЫКАТОВІЧЫ» ІМЯ СТАЛІНА, «ВІШНЕЎКА», «ЗАМОШША» і іншых плян камплектаваньня на выканан нават і НА ПАЛОВУ.

У адказ на адозву партыі і ўраду рабочыя калектывы гэтых саўгасаў прынялі на сябе рад канкрэтных самаабавязацельстваў па ліквідацыі прарываў і выкананьні ў тэрмін будаўніцтва і камплектаваньня стада. Але кіраўніцтва гэтых саўгасаў і зараз ня здолела стаць на чале ініцыятывы мас, ня ажыцьцявіла прапаноў рабочых аб арганізацыі кантролю і дапамогі загатоўчым аддзяленьням Белмяса. Рад дырэктароў усё яшчэ спадзяюцца на самацёк.

Яшчэ горш з укамплектаваньнем СЬВІНАГАДОЎЧЫХ КАЛГАСНЫХ ФЭРМ. Да канца году ў СТФ павінна быць 150.000 СЬВІНАМАТАК. На 1 верасьня плян камплектаваньня сьвінагадоўчых фэрм выканан толькі на 29,1 ПРОЦ.

Асноўныя раёны разьвіцьця калгаснай таварнай сьвінагадоўлі—жывёлагадоўча-бульбяныя раёны, на якія прыпадае выкананьне больш паловы пляну камплектаваньня, усё яшчэ ІДУЦЬ МІМА цэнтральнай задачы, пастаўленай партыяй і ўрадам.

Гэтыя раёны павінны паставіць у калгасных фэрмах 82.000 сьвінаматак. На 1 верасьня было пастаўлена толькі 21.000. Процант выкананьня пляну У ГЭТЫХ раёнах дасягае 26—ніжэй агульна-рэспубліканскага.

Такія раёны, як ПРАПОЙСКІ, БЯРЭЗІНСКІ І КЛІЧАЎСКІ даюць ганебныя лічбы выкананьня пляну—ад 5 да 13 проц. Гэтыя лічбы з усёй выразнасьцю сьведчаць аб тым, што ў радзе раёнаў яшчэ не пераможаны апартуністычныя адносіны да пытаньняў разьвіцьця калгаснай сьвінагадоўлі.

ПРАКТЫКА ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ БССР— «КАМБАЙН», «СЛУЧ», «КАМІНТЭРН» (СЛУЦКІ РАЁН), ЯКІЯ ЎЖО АМАЛЬ СКОНЧЫЛІ ПЛЯНЫ КАМПЛЕКТАВАНЬНЯ СЬВІНАГАДОЎЧЫХ ФЭРМ, ПАКАЗВАЮЦЬ, ШТО ЗАДАНЬНЕ ПАРТЫІ І ЎРАДУ ЗУСІМ РЭАЛЬНАЕ І МОЖА БЫЦЬ ВЫКАНАНА.

Праўленьні гэтых калгасаў здолелі так паставіць пытаньне аб камплектаваньні фэрм перад калгаснай масай, што самі калгаснікі заключылі адпаведныя дагаворы з праўленьнямі, здалі сваіх сьвіней на фэрмы і выпучылі ў якасьці пастаянных работнікаў на фэрмы лепшых калгаснікаў-ударнікаў. Практыку гэтых ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ ТРЭБА ПЕРАНЕСЬЦІ НА ЎСЕ КАЛГАСЫ БССР.

Значна ЛЕПШ ідзе камплектаваньне МАЛОЧНЫХ ТАВАРНЫХ ФЭРМ. На 1-га верасьня ў МТФ было 59.000 КАРОЎ — 72,5 проц. пляну камплектаваньня. Але тут мы маем другі буйны недахоп у справе БУДАЎНІЦТВА ФЭРМ. Саўнаркомам БССР было паказана, што ў сярэднім на фэрме павінна быць да 175 кароў. На сёньшні дзень мы маем у сярэднім на фэрме 68-70 кароў. Гэта значыць, што ў БССР дагэтуль арганізоўваліся пераважна «карлікавыя» фэрмы, што значна зьмяншае іх рэнтабельнасьць і таварнасьць.

Папаўненьне МТФ маладняком ЗА КОШТ УНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ, за кошт АБАГУЛЕНЬНЯ ЖЫВЁЛЫ саміх калгаснікаў нездавальняючае.

Большасьць кароў, якія мы маем у МТФ, эскуплены ў аддзяленьнях Белмяса. Гэта мы бачым на прыкладзе раду калгасаў. Так, у калгасе «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА», Бабруйскага раёну, з 274 кароў, толькі 8 аграмаджаных. У калгасе «НОВАЕ ЛЯДЦО», Пухавіцкага раёну, з 97 кароў толькі 18 аграмаджаных. У калгасе «БАЛЬШАВІК», Менскага раёну, з 137 кароў, адна абагулена.

Гэтыя лічбы даволі выразна паказваюць, што МНОГІЯ РАЙКАЛГАССАЮЗЫ НЕ ВЯДУЦЬ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПУНКТУ СТАТУТУ С.-Г. АРЦЕЛІ АБ АГРАМАДЖАНЬНІ ДРУГІХ І ТРЭЦІХ КАРОЎ КАЛГАСЬНІКАЎ.

Верасень — РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ камплектаваньня стада. Кожны прапушчаны дзень замаруджвае тэмпы разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Вакол пытаньняў камплектаваньня павінна зараз быць сканцэнтравана ўся ўвага раённых партыйных арганізацый. Райкомы, райвыканкомы, райкалгассаюзы павінны ўзяць пад непасрэдны кантроль ход камплектаваньня стада жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных фэрм.

Непасрэдная дапамога загатоўчым пунктам Белмяса, пасылкай саўгасных і калгасных брыгад у раёны загатовак, мабілізацыяй уласных рэсурсаў саміх калгаснікаў і штодзённым кантролем—можа быць выканана ў тэрмін камплектаваньне стада.

Побач з фарсаваньнем камплектаваньня ў цэнтры ўвагі саўгасаў і калгасных таварных фэрм павінна быць БУДАЎНІЦАТВА СКОТНЫХ ДВАРОЎ І СЬВІНАРНІКАЎ. Да наступленьне зімовых холадоў ва што б там ні стала ўсё стада павінна быць пастаўлена пад дах.

Па саўгасах «Сьвінаводу» будаўніцтва яшчэ далёка не набыло патрэбных тэмпаў. З 564 распачатых сьвінарнікаў, закончана будаўніцтва ўсяго 102.

Ня лепш і з будаўніцтвам у калгасных фэрмах.

Пара пакласьці канец усім опасыпаньням на «аб'ектыўныя» прычыны, на недахват цьвікоў і дахавага матар'ялу.

Партыяй дана зусім ясная дырэктыва — там, дзе не хапае цьвікоў або гонты — безадкладна крыць саломай. Не сядзець і чакаць у мора надвор'я, а пабаявому ўзяцца за загатоўку саломы ў сваёй-жа гаспадарцы, у сельсавеце—вось задача, пастаўленая перад будаўнічымі вучасткамі, дырэкцыямі саўгасаў і праўленьнямі калгасаў.

У БЛІЖЭЙШЫЯ-ЖА ДЗЬВЕ ДЭКАДЫ павінны быць пакрыты ўсе пабудаваныя сьвінарнікі і скотныя двары.

Барацьбой з апартуністычным замаражваньнем тэмпаў, мабілізацыяй ініцыятывы і ўвагі рабочых калектываў саўгасаў і калгасных мас вакол пытаньняў камплектаваньня стада і будаўніцтва, разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на будоўлях будзе пераможна вырашана жывёлагадоўчая праблема — цэнтральная задача, пастаўленая партыяй на бліжэйшы час у галіне сельскай гаспадаркі.

Забастовачны фронт у Польшчы пашыраецца

У апошні час, у сувязі з умоцненым наступленьнем капіталістаў на правы і зарплату рабочых, расьце хваля забастовак.

Пару дзён таму назад мы пісалі аб забастоўцы рабочых панчошных фабрык у Лодзі.

«Роботнік» ад 12 верасьня паведамляе аб усеагульнай забастоўцы шаўцоў ва ўсім Пілецкім павеце. Шаўцы пры 16-гадзінным рабочым дні атрымлівалі ледзь 20 зпотых у тыдзень, ня былі забясьпечаны ад беспрацоўя. Беспрацоўныя шаўцы не атрымлівалі нават тэй мізэрнай дапамогі, якая выдаецца іншым беспрацоўным.

3-га верасьня шаўцы прыступілі да забастоўкі пад лёзунгам: павялічэньне зарплаты, забесьпячэньня ад беспрацоўя і залічэньня ў члены касы хворых. Салідарная забастоўка трывае ўжо больш тыдню.

У Беластоку адбылося магутная забастоўка рабочых Фабрыкі плюшу «Э. Бэкер і К-о» («Работнік» ад 13 верасьня.

Гэты-ж нумар «Работніка» паведамляе аб радзе забастовак сельска-гаспадарчых рабочых у маёнтках цэнтральнай і заходняй Польшчы. Рабочыя дамагаліся выплаты зарплаты, якой яны ўжо па некалькі месяцаў не атрымліваюць, а таксама паляпшэньня ўмоў працы і прызнаньня прафсаюзаў.

Усе забастоўкі адзначаюцца баявым характарам.

ІМІ ПАСЕЯНА ТОЛЬКІ 30,2% ПЛЯНУ

ПОЎНАСЬЦЮ НАГРУЗІЦЬ ТРАКТАРНЫ ПАРК, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ МТС ЗМАЗАЧНЫМ

КОЖНАЯ ГАДЗІНА ПРАСТОЮ—УДАР ПА ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ АЗІМЫХ

ЗВОДКА

аб ходзе сяўбы азімых і зяблёва па саўгастрэстах і іншых саўгасных сыстэмах БССР

Па становішчы на 10 верасьня 1931 году

Назва саўгасных сыстэм	Засеяна ўсяго азімых (у проц. да пляну)	У тым ліку Жыта	Пшаніцы	Авёс. ячмі	Узорана на зяб (у проц. да пляну)
Белсаўгастрэст	48,4	49,5	54,4	9,3	5,1
Белкантора «Сьвінавод»	27,5	28,3	11,3	—	3,5
» Насеннавод	35,1	32,7	48,4	43,8	2,6
Белсельаб'яднаньне	14,1	14,1	—	—	8,4
Ільнаканапляводсаўгастрэст	4,4	4,4	—	—	12,9
Маслатрэст	—	—	—	—	3,1
Лугавы трэст	—	—	—	—	2,0
С.-г. калёнія НКЮ	47,5	49,4	—	—	21,3
Іншыя сыстэмы	—	—	—	—	—
Усяго	30,2	29,8	40,6	18,0	4,8

Увага: Па іншых сыстэмах (дзіцячыя калёніі, навучальныя фэрмы, дасьледчыя ўстановы, дзяржконзавод і Лесбел) весткі аб выкананьні неатрыманы з пачатку кампаніі.

ПАСЕЎБЮРО НКЗБ.

Сяўба ў калгасе «Шлях сацыялізму».

Толькі 25 проц.

КЛІЧАЎ. Асеньняя сяўба ў Клічаўскім раёне разгортваецца вельмі слаба. На 10 верасьня па калгасах засеяна толькі 25 проц. пляну. Асабліва адстаюць наступныя калгасы: калгас імя Мопатава, які яшчэ зусім не пачынаў сяўбы, калгас «Авангард», які засеяў замест 490 гэкт. толькі 100. У калгасе «Новы быт» да гэтага часу яшчэ не падрыхтавана глеба пад азімыя.

Ня гледячы на такія прарывы ў калгасах, райкалгассаюз ня прымае ніякіх мер.

Асноўнымі прычынамі марудных тэмпаў сяўбы ў значнай частцы калгасаў зьяўляецца адсутнасьць зьдзельшчыны, хаця калгасы і лічацца пераведзенымі на зьдзельшчыну, а таксама адсутнасьць уліку працы. Калгаснікам запісваюць працадні незалежна ад таго, колькі выпрацавалі той ці іншы калгаснік. Абязьлічка яшчэ не ліквідавана. Цягавая сіла скарыстоўваецца вельмі дрэнна: коні, с.-г. машыны, інвэнтар не прымацаваны да пасобных калгаснікаў («Авангард», «Гігант», «Наша праца»).

Раённыя арганізацыі і асабліва райкалгассаюз у бліжэйшы час павінны ліквідаваць паяўныя прарывы ў калгасах і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці за адцягваньне сяўбы азімых.

Сеюць неачышчаным насеньнем

4 калгасы ня скончылі дваеньня папару

ВУШАЧЫ. (Наш кар.). Сяўба азімых па Вушацкім раёне праходзіць чарапашымі тэмпамі. Калгасы «Блізбожнік», «Чырвоная зорка», імя Красіна, «Чырвоная Полаччына» яшчэ ня скончылі дваеньня папару.

Асноўнай прычынай марудных тэмпаў сяўбы зьяўляецца нялічэньне ўвязаць гэтай работы са скончэньнем уборкі яравых культур і апрацоўкі ільну. Калгасы ўсё спасылаюцца на недахват рабочай сілы, тады, як большасьць жанчын гэтых калгасаў ня выходзіць на работу. У калгасах дрэнна наладжан улік працы зьдзельшчына яшчэ слаба ўкаранена на с.-г. работах. У выніку мужчыны заняты апрацоўкай ільну.

Недапушчальным зьяўляецца і той факт, што ў Весьніцкім і В. Далецкім сельсаветах сяўбу праводзяць неачышчаным насеньнем. Парт'ячэйкі і сельсветы прайшлі міма гэтага важнейшага мерапрыемства і не прынялі ніякіх захадаў па арганізацыі збожжаачышчальных абозаў.

Вушачына калектывізаваня толькі на 58 проц. Таму адназасобны сэктар навінен засеяць у гэтым годзе пад азімыя амаль што палову азімага кліну. Аднак, сяўба ў аднаасобным сэктары праходзіць яшчэ горш чым у адсталых калгасах. Гэта адставаньне тлумачыцца выключна тым, што сярод іх не праводзіцца ніякай масавай і растлумачальнай работы.

Задача раённых арганізацый—прыняць усе належныя меры па ліквідацыі прарыву ў сяўбе азімых па калгасах і аднаасобным сэктары.

Ліпаўка Ян.

Скончылі сяўбу

ЖЛОБІН, 14. (БелТА). Калгас «ЧЫРВОНАЯ ІСКРА», Чарназемскага сельсавету скончыў сяўбу азімых, абмалот жыта і расьціп ільну. Пасеў азімых на плошчы 140 гэкт. быў праведзен на працягу 3 дзён. Таксама скончылі сяўбу калгасы ІМЯ ЯКАЎЛЕВА, ЧАПАЕВА і «ПРАЛЕТАРЫ», Гусьпічанскага сельсавету.

Калгас «РАСЬСЬВЕТ-ПЕРАМОЖЦА» таксама скончыў сяўбу азімых і засеяў 180 гэкт. жыта і 20 гэкт. азімай пшаніцы. Зараз калгасы пераключаюць усе сілы на зяблёва.

* *

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Калгас «ЧЫРВОНЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ», Саматэвіцкага сельсавету, які складаецца з 575 гаспадарак, 11 верасьня скончыў сяўбу азімых на плошчы 680 гэкт. Зараз калгас пераключыў усю вольную сілу на дапамогу па ўборцы суседняму саўгасу Саматэвічы.

РУДЗЕНЯ, БАЛЬШУНОЎ.

Сяварка іржавее больш году

У Сенеенскім калгасе «Чырвоны спэцыяліст», (Менскі раён) ляжыць трактарная радковая сяварка. Машына пакінута яшчэ ўлетку 1930 году Койдалаўскай МТС. Сяварка замежнага вырабу, ляжыць пад адкрытым небам і іржавее.

Пракуратура павінна сказаць сваё аўтарытэтнае слова аб такіх агідных адносінах да скарыстаньня замежнай машыны.

Я. Лукашэвіч.

Трактары больш прастойваюць чым працуюць

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Раньняя сяўба азімых у Старадарожскім раёне гапебна правалена. Ні адзін калгас ня скончыў сяўбы, а наадварот толькі пачынаецца сяўба.

Па калгасах, якія абслугоўвае МТС, засеяна 190 гэкт. з пляну 23000 гэкт. МТС не спраўляецца з падрыхтоўкай глебы для сяўбы. 28 трактараў сыстэматычна робяць прастоі, дзень працуюць, а поўдня стаяць. 8-га верасьня ўсе трактары ня выйшлі на працу з-за адсутнасьці змазачнага.

Л. Ягорчанка.

Каштоўныя с.-г. машыны пад дажджом

У калгасе імя Варашылава (Менскі раён) каштоўныя сельска-гаспадарчыя машыны валяюцца пад адкрытым небам. Старшыня калгасу і яго намесьнік адказваюць, што няма дзе іх паставіць. Аднак мы выявілі, што павець у калгасе ёсьць. Пад ёй стаяць старыя паламаныя разы, нікуды ня вартая брычка і іншы нескаштоўны інвэнтар, а новыя, дыфіцытныя с.-х. машыны мокнуць пад дажджом, іржавеюць і ў хуткім часе прыдуць у негодніасьць.

Старшыня калгасу імя Варашылава павінен несьці адказнасьць перад адпаведнымі ўстановамі за псаваньне новых машын.

Сямёнаў, Фінкель, Харушка, Янушэўскі, Цывес.

Дырэкцыя Капыльскай МТС ня турбуецца

КАПЫЛЬ.. У калгасе «Ільніч» Бабаўнянскага сельсавету, пачынаючы з 9-га верасьня стаяць без работы 2 трактары, з-за адсутнасьці змазачных матар'ялаў. Тое-ж самае наглядаецца ў калгасе «Зьмена». Дырэктар Капыльскай МТС дае прадстаўніком калгасу нсаступны адказ: «змазачных нам не даюць і мы вам не дамо».

За прастой трактараў павінна адказваць дырэкцыя Капыльскай МТС. Неабходна зараз-жа забясьпечыць трактары змазачнымі матар'ялямі.

А.

Ачысьціць калгас „Уперад" ад кулакоў

ТАЛАЧЫН. Калгас «Уперад», Старасельскага сельсавету, налічвае 60 гаспадарак. Калгас да гэтага часу гаспадарча не ўмацован, арганізацыйна не афармлен. Зьдзельшчына ня ўведзена, працоўная дысцыпліна сярод калгаснікаў зусім адсутнічае. Жыта не аграмаджана насенны фонд ня створан. Да сяўбы 120 га азімых калгас не прыступіў. У калгас пралезьлі клясава-варожыя элементы, якія вядуць падрыўную работу, хочуць развяліць калгас з сярэдзіны.

Талачынскі райкалгассаюз павінен ачысьціць калгас ад кулакоў, увесьці зьдзельшчыну, якая зьявіцца асноўнай зарукай арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў.

Росман

Прагулы па віне начальніка вучастку

САМАХВАЛАВІЧЫ. Першы вучастак Белсельбуду вядзе будаўніцтва абор і цялятнікаў у племгасе імя Камінтэрну.

З прычыны бюракратычных адносін начальніка вучастку тав. СЯРГЕЕНКА да пляннавага забесьпячэньня будаўніцтва матар'ялямі і рабочых прамтаварамі—на пабудовах стварыўся прарыў.

На складзе вучастку па тры месяцы ляжаць прамтавары, а цесьляры трацяць цэлыя дні, дамагаючыся водпуску тавараў.

Нядаўна начальнік вучастку паехаў у Менск і аддаў загад—без яго нікому не даваць матар'ялаў. У гэты час прыбылі з саўгасу за цьвікамі, бо рабочыя, з прычыны адсутнасьці цьвікоў, не маглі працаваць, але загадчык складам, атрымаўшы загад начальніка вучастку, цьвікоў ня даў.

Рабочыя прымушаны былі прагуляць некалькі дзён. Такія недарэчнасьці, з прычыны бюракратызму і нераспарадчасьці начальніка вучастку, адбываюцца амаль штодзённа.

СЁМКІН.

Наркамснаб спазьніўся з падрыхтоўкай

Брыгада, якая азнаёмілася з падрыхтоўкай Наркамснабу да ільназагатовак, перш за ўсё сустрэлася з фактамі непадрыхтаванасьці НКС, як рэгулюючай арганізацыі, да загатовак ільну.

Адказны выканаўца па ільне тав. МАЙЗЭЛЬС імкнуўся даказаць што ў позьняй падрыхтоўцы вінаваты« аб'ектыўныя прычыны»: агульны плян ільназагатовак быў распрацован сваячасова ў першых лічбах жніўня, але ён ня быў зацьверджан у Маскве і да 3 верасьня ня мог быць даведзен да раёнаў.

У адносінах дачы цьвёрдых заданьняў кулацка - заможным гаспадаркам Наркамснаб абмежаваўся агульнай дырэктывай, спэцыяльны плян цьвёрдых заданьняў па ільназагатоўках не пасланы.

Наркамснаб амаль нічога не зрабіў у галіне рэалізацыі і афармленьня кантрактацыйных дагавораў. Ня гледзячы на вялізарнае значэньне кантрактацыі ільну ў справе плянавага забесьпячэньня тэкстыльнай прамысловасьці сырцом, Наркамснаб да сёньшняга дня ня мае пляну, колькі павінна паступіць у гэтым годзе ільну і канапель ад кантрактантаў. Тав. Майзэльс матывуе гэта тым, што ільнаводсаюз ня даў патрэбных вестак аб гэтым.

Раённыя пляны распрацаваны і спушчаны на месцы толькі 8-9 верасьня. Можна з упэўненасьцю сказаць, што ні адзін раён не прыступіў да канкрэтнага ажыцьцяўленьня плянаў, бо не пасланы падрабязныя інструкцыі аб правядзеньні ільназагатоўчай кампаніі. Гэта інструкцыя дагэтуль вандруе па сталох работнікаў Наркамснабу.

Між тым, некаторыя паўднёвыя раёны ўжо апрацавалі значную частку ільну і гатовы да здачы. Але загатоўшчыкі не падрыхтаваны, не наладжан канвэер паміж апрацоўкай і здачай.

Тэрмін пачатку і скончэньня ільназагатоўчай кампаніі ўстаноўлен для ўсіх раёнаў аднолькава, незалежна ад зон. Плян загатовак Ільна - валакна наступны: у кастрычніку павінна паступіць 10 проц. гадавога пляну, у лістападзе—25 проц., у сьнежні—45 проц.; пяньки павінна быць загатоўлена ў лістападзе 10 проц., у сьнежні—30 проц., у студзені—30 проц., у лютым—20 проц., у верасьні трэба загатовіць 25 проц. заданьня па ільняным і канапляным семі, у кастрычніку — 45 проц., у лістападзе—30 проц.

Каб зьнішчыць недахопы, якія мелі месца ў мінулым годзе ў галіне ўліку загатовак, зараз устаноўлена, што ў кожным раёне загатоўкі вядзе толькі адна арганізацыя: у ільнаводчых раёнах ільнаводкаапэрацыя, у іншых — спажывецкая.

У гэтым годзе значна зьменена сыстэма прэміраваньня здатчыкаў тэхкультур. Скасаваны вызначаныя раней процанты прэміраваньня за здачу ільну або канапель. Усе віды прамтавараў у часе ільназагатовак будуць адпушчаны ў першую чаргу лепшым здатчыкам.

Для прэміраваньня здатчыкаў тэхкультур паслана ў раёны 400 тон макухі, дан нарад Белсельпрамаб'яднаньню на адгрузку 450 тон алею. На чацьверты квартал адпушчана прамтавараў на суму 3.075.000 руб., на верасень вызначана для ільнаводчых раёнаў 2.200 тон збожжа. Адказная задача каапэрацыйных арганізацый — сваячасова выканаць нарады і даставіць прамтавары на месцы.

Наркамснаб павінен дабіцца рашучага пералому ў падрыхтоўцы да прыёмкі ільну. Неабходна паскорыць афармленьне інструкцый аб ільназагатоўках, разгарнуць шырокую растлумачальную работу, каб ні адно кілё ільну і пяньки ня трапіла на прыватны рынак.

Трэба дабіцца пералому ў справе рэалізацыі кантрактацыйных дагавораў.

Пры ўмове правядзеньня шырокай работы вакол ільназагатовак і рашучага націску на кулака плян будзе поўнасьцю выканан і перавыкананы.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды»:
НІКІЦІН, РЭЗЬНІК, БЛЯХЕР.

Загатоўшчыкі не сьпяшаюцца

Ня гледзячы на тое, што БССР ужо ўступіла ў паласу загатовак ільну, Белкаапсаюз дагэтуль амаль не падрыхтаваўся да кампаніі. Работнікі з Белкаапсаюзу заявілі брыгадзе, што ў спазьненьні з падрыхтоўкай вінаваты Наркамснаб, які не паклапаціўся раней прысласць для загатовак. Апошні быў атрыман толькі 11 верасьня.

Раённыя інструктары БКС паведамляюць, што на месцах вельмі мала чаго зроблена, каб падрыхтаваць склады і мяшкі. У гэтых адносінах становішча яўна пагражаючае. Работнікі БКС супакойваюць сябе тым, што, маў, ня будзе вялікага скапленьня загатоўленага ільну і можна будзе адразу адгружаць яго.

Амаль нічога ня зроблена ў галіне падрыхтоўкі кадраў. Работнікі Белкаапсаюзу знайшлі апраўданьне сваёй бязьдзейнасьці тым, што яны быццам ня ведалі, ці будзе Белкаапсаюз наогул займацца загатоўкай ільну.

Больш здавальняюча падрыхтаваўся да ільназагатовак Белпільнасаюз. Выдаткавана на падрыхтоўку кадраў каля 30.000 руб. Некаторыя са с кончэньнем курсы работнікаў змогуць з посьпехам справіцца з даручанай ім работай.

Паводле пляну, трэба было пабудаваць на лініі Белкалгасцэнтру на месцах 400 ільнаапрацоўчых пунктаў, ёсьць усяго толькі 186, што складае 48 проц. выкананьня пляну.

Асноўная задача ільназагатоўчых арганізацый—зараз-жа ліквідаваць разрыў паміж уборкай, абмалотам, апрацоўкай і загатоўкай ільну, арганізаваць суцэльны ільняны канвэер. Вялікую дапамогу ў гэтым ім павінны аказаць Белкалгасцэнтр і Трактарацэнтр.

Брыгада «Праўды» і «Зьвязды»:
КАГАН, ЭПШТЭЙН, УФЛЯНД, ЧЭРЧЭС, ГІМЭЛЬШТЭЙН І ХАДАСЭВІЧ.

Аб'яднаны рэйд ударнікаў „Праўды" і „Зьвязды"

ІЛЬНАЗАГАТОЎКІ СУСТРЭЦЬ ВА ЎСЕЎЗБРАЕНЬНІ

БССР павінна загатовіць Ільнавалакна ў 2 с пал. разы больш, чым летась. Толькі ў рашучай барацьбе з клясавым ворагам пры ўмове шырокага разгортваньня масавай работы мы справімся з гэтай задачай.

ПАЧАЛІ ЗДАЧУ ІЛЬНУ

ДУБРОЎНА. Калгас „Чырвонае Чубакова", Цілевіцкага сельсавету, скончыў уборку ільну, разаслаў і абмалаціў 20 гэктараў. Звыш 3-х тон насеньня здана на склад райкаапсаюзу. Сушыльны і мяльны пункты падрыхтаваны да апрацоўкі ільну, адрамантаваны ільнацёркі.

Чарнаўскі

175.000 ТОН БУЛЬБЫ—ЛЕНІНГРАДУ

З 20-га верасьня штодзенна адгружаць 200 вагонаў бульбы

БССР—адзін з асноўных пастаўшчыкоў бульбы прамысловым цэнтрам СССР. У гэтым годзе БССР павінна адгрузіць Ленінграду 175.000 тон бульбы. З гэтай колькасьці 7.400 тон трэба адправіць да 15 верасьня. Поўнасьцю плян адгрузкі павінен быць скончан да 15 лістапада.

Гэта баявая задача можа і павінна быць поўнасьцю і сваячасова рэалізавана: Для гэтага трэба, каб загатоўчыя сыстэмы БССР разгарнулі сапраўды баявыя тэмпы работы, каб на шляху бульбы — ад палёў БССР да Ленінграду — ня было ніякіх торможаў.

Посьпех адгрузкі залежыць непасрэдна ад пасьпяховасьці загатовак бульбы. Гэта кампанія павінна прыцягнуць увагу ўсіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый. Белсаюз, Белільнасаюз і Белкаапсаюз, якія кіруюць загатоўкамі і адгрузкай бульбы, павінны наладзіць бесьперабойную работу загатоўчых пунктаў, сыстэматычнае жывое кіраўніцтва імі. Сыстэмы Белкаапсаюзу і Белільнасаюзу на месцах павінны забясьпечыць поўнасьцю тэхнічную базу загатовак і адгрузкі. Ніякіх «аб'ектыўных прычын», ніякай маруднасьці ў гэтай кампаніі нельга дапусьціць.

Паводле заданьня партыі і ўраду, 15 раёнаў павінны арганізаваць датэрміновае капаньне і адгрузку бульбы, пачынаючы з 17 верасьня. Церахаўскі, Буда - Кашалёўскі, Жлобінскі, Бабруйскі, Асіпавіцкі, Лельчыцкі, Тураўскі, Дубровенскі і Касьцюковіцкі раёны павінны адгружаць штодзенна ня менш аднаго вагона бульбы, Уваравіцкі, Рагачоўскі, Шклоўскі, Бялынічскі і Крупскі — ня менш двух вагонаў, прычым колькасьць адгрузкі павінна паступова парастаць з такім разьлікам, каб агульны плян быў поўнасьцю выканан не пазьней 15 лістапада.

Фарсаваць адгрузку

За подпісамі т. т. Шаранговіча і Галадзеда паведамана наступная тэлеграма Церахаўскаму, Буда-Кашалёўскаму, Уваравіцкаму, Жлобінскаму, Рагачоўскаму, Шклоўскаму, Бабруйскаму, Асіпавіцкаму, Клічаўскаму, Бялынічскаму, Лельчыцкаму, Тураўскаму, Крупскаму Дубровенскаму і Касьцюковіцкаму раёнам.

„За апошні час адгрузка бульбы Ленінграду зусім спынілася. БССР—асноўны пастаўшчык бульбы. У сувязі з гэтым ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапануюць зараз-жа арганізаваць датэрміновае капаньне і адгрузку бульбы ў Ленінград, згодна нарадаў, пачынаючы з 17 верасьня, з паступовым нарастаньнем адгрузкі з такім разьлікам, каб поўнасьцю скончыць вываз не пазьней 15 лістапада"

Пачынаючы з 20 верасьня, сыстэмы спажывецкай і сельска - гаспадарчай каапэрацыі павінны будуць адгружаць штодзенна ня менш 200 вагонаў бульбы. Гэта адказьнейшае заданьне патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў, упартай барацьбы за плян.

БССР павінна поўнасьцю і сваячасова выканаць свае абавязкі перад пралетарскімі цэнтрамі і ў першую чаргу перад чырвонай сталіцай — Ленінградам.

Пралетарская дапамога ўборцы гародніны

ВОРША. Нядаўна агульна - вузлавы сход жанчын — жонак рабочых Аршанскага чыгуначнага вузла — абвясьціў сябе ўдарным па дапамозе ўборцы ўраджаю бульбы. Сход высунуў лёзунг: «Ні аднаго кілё гародніны і бульбы не пакінуць на полі». Адначасова сход выклікаў на сацпаборніцтва па лепшым удзеле ва ўборцы ўраджаю бульбы жонак рабочых МЕНСКАГА І ВІЦЕБСКАГА ВУЗЛОЎ.

Работніцы і жонкі рабочых Аршанскага чыгуначнага вузла ўвесь час паказваюць лепшы прыклад удзелу і дапамогі прыгараднай гаспадарцы ТСТ. У веснавую сяўбу яны адпрацавалі 1.300 працадзён.

Дапамога работніц прыгараднай гаспадарцы дала магчымасьць сваячасова і з посьпехам скончыць пасеўную кампанію.

У часе праполкі і ўборкі сена жанчыны адпрацавалі 3.800 працадзён.

Зараз вядзецца збор сродкаў на куплю трактара для прыгараднай гаспадаркі.

Ф. МАЙСЕЙЧ

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

УЗЬНЯЦЬ ЯКАСЬЦЬ,

палепшыць мэтадычнае кіраўніцтва

На справе прыступіць да перабудовы работы ў адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б) аб масавай школе.—Ліквідаваць прарыў у школьным будаўніцтве

Пастанову ЦК—у практыку работы школ

У сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе пры ЦП саюзу працаясьветы адбылася спэцыяльная нарад па гэтым пытаньні.

Прэзыдыум ЦП разам з калегіяй Наркамасьветы распрацавалі дырэктыўны ліст аб папулярызацыі пастановы ЦК УсеКП(б) сярод шырокіх мас насельніцтва.

Нарада адзначыла, што ў радзе месц наглядаюцца яўныя скрыўленьні справы палітэхнізацыі. Шмат школ не заключылі дагавароў з прадпрыемствамі, саўгасамі і калгасамі. Нарада выказалася, каб да 1 кастрычніка ўсе школы заключылі дагаворы з рознымі прадпрыемствамі, дэтальна абгаварылі іх на сходах калгаснікаў і рабочых.

Да 1 студзеня ва ўсіх школах патрэбна арганізаваць рабочыя пакоі і майстэрні.

Мэтадычная работа ў большасьці раёнаў знаходзіцца ў занядбадзе. Таму ЦП саюзу разам з калегіяй Наркамасьветы абавязаліся ў самым хуткім часе пераглядзець становішча раймэтадкомай на месцах.

У гэтым годзе кожны настаўнік павінен прайсьці вытворчую практыку, у мэтах набыцьця ўсебаковых тэхнічных ведаў. Праграмы па гэтым пытаньні адсутнічаюць. Наркамасьветы павінен у самым хуткім часе прыступіць да складаньня апошніх.

Вытворчыя нарады на месцах па большасьці раёнаў ніякай работы не праводзяць. Нават некаторыя раённыя адказныя работнікі не разумеюць сутнасьці вытворчых нарад. ЦП працасьветы ўзяло на сябе абавязак у дэкадны тэрмін распрацаваць дакладнае палажэньне аб вытворчых нарадах.

Завочнае навучаньне не пастаўлена на належную вышыню і па радзе месц правалена і гэта ў той час, як кожны настаўнік, які ня мае вышэйшай адукацыі, павінен займацца завочным навучаньнем.

У некаторых раёнах недаўкамплектаваны школы, з прычыны чаго заняткі да гэтага часу не распачаліся. Наркамасьветы накіраваў 7 брыгад для тэрміновай ліквідацыі гэтых правываў.

У сувязі з падрыхтоўкай да 6-га пленуму ЦП працасьветы, калегія Наркамасьветы і ЦП саюзу мабілізавалі ўсіх сваіх членаў у больш буйнейшыя раёны Беларусі ў мэтах практычнага праламленьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе.

Я.

10 ШКОЛ НЕ ПАЧАЛІ ЗАНЯТКАЎ

АСІПАВІЧЫ, 11. (БЕЛТА). Навучальны год на Асіпавіцкім раёне пачаўся з вялікім спазьненьнем. Не пачалі навучаньня яшчэ 10 школ. Ня скончана будаўніцтва 4 школ, у той час, як заданьне было скончыць да 1 верасьня. У шасьці школах жывуць прыватныя асобы і з-за гэтага нельга распачаць заняткаў.

Перапіс дзяцей школьнага ўзросту ня скончан, а ў некаторых сельсаветах не праводзіўся ўсім.

Райінспэктар працуе ўсьляпую, абсалютна ня ведае становішча на месцах. РВК ўсім не аддае ўвагі школьнаму будаўніцтву.

Адправілі толькі 50 процантаў

У Бярэзінскі райспажыўсаюз павінна прыбыць гатовай вопраткі для бяднейшых вучняў на 10.233 рублі і 543 пары абутку. Пакуль што атрымана райспажыўсаюзам вопраткі і абутку ўсяго на 5.508 руб.

Марудзіць з адгрузкай віцебская база Белкаапсаюзу. Апошняя павінна накіраваць 59 польтаў, 28 пар штаноў і 18 халатаў, гомельская база—17 капуль, 170 пар штаноў, 195 шапак; магілеўская фабрыка імя Валадарскага—180 польтаў; віцебская фабрыка — 110 пар абутку і менская—390 пар абутку.

Белкаапсаюз павінен рашуча ўзьдзейнічаць на ўсе аддзяленьні і тэрмінова накіраваць абутак і вопратку школам.

Джыгер.

Загатоўлены матар'ял гніе

НЕГАРЭЛАЕ (БЕЛТА). Дзень вучобы па Негарэльскім сельсавеце сарваны. Партыйныя, прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі недаацанілі гэтай важнай кампаніі.

У Негарэльскай ШКМ памяшканьні зусім не падрыхтаваны. Няма належнага інвэнтару. Паводле пляну трэба было пабудаваць новую школу, але вышла блытаніна з крэдытамі, і пабудова школы спынілася. Будынак і загатоўлены матар'ял гніе.

Мезінэўская школа застаецца без рамонту з-за адсутнасьці цэглы. Ня лепш стаіць справа з іншымі школамі ў сельсавеце.

Знайсьці і пакараць вінаватых

ПОЛАЦАК. З прычыны непадрыхтаванасьці да навучальнага году рад сельсаветаў Полацкага раёну не пачаў своячасова заняткаў.

Зусім неўпарадкаваны школы Турнецкая, Хараўская, Пэшкоўская, Бікуніцкая і іншыя. Ня скончаны рамонт, адсутнічае абсталяваньне. Гомельскі сельсавет пальцам аб палец ня ўдарыў для ўнаўпарадкаваньня школ.

Юраўцкая трохкамплектная школа капітальнага рамонту не зрабіла, а таму і заняткі распачаць нельга. Такое-ж становішча і ва Ўхвіцкай, Бабыніцкай, Даўмікоўскай, Казіміраўскай і Завозерскай школах.

Астрэйка.

БДУ НАПЯРЭДАДНІ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт і вышэйшы Пэдінстытут пачынаюць новы навучальны год. У гэтым годзе паказаныя ВНУ павінны пабудаваць работу так, каб з посьпехам выканаць дырэктывы партыі.

Навучальныя пляны ўжо складзены і зацьверджаны Наркамасьветы па кожным факультэце і аддзяленьні БДУ і вышэйшага пэдінстытуту. Праграмы па асноўных дысцыплінах набыты. Навучаньне будзе пабудавана толькі на актыўных мэтадах выкладаньня. Адгэтуль пашыраецца работа катэдраў, якія павінны цалкам адказваць і за мэтадычны бок работы. Паляпшэньне колькаснага і якаснага вучоту акадэмічнай работы важная задача, якая стаіць перад навуковымі працаўнікамі і студэнцтвам БДУ і пэдінстытуту.

Асенні набор студэнтаў у гэтыя навучальныя ўстановы ўжо скончыўся. Сёлетні набор у параўнаньні з мінулым значна лепшы. На 90 месц у ВДУ было падана 311 заяў і на 150 месц вышэйшага пэдінстытуту 241 заява. З 90 асоб, якія прыняты на факультэт і ваўфак БДУ рабочыя і іх дзеці складаюць 62 проц., сяляне - калгаснікі 28 проц., служачыя 10 проц. Партыйна-камсамольская праслойка сярод прынятых 51 проц.

Сярод прынятых на літаратурны, сацыяльна - эканамічны і педалёга-педагагічны факультэты вышэйшага пэдінстытуту рабочых і іх дзяцей 51 процант, сялян-калгаснікаў 35 і служачых 14 проц. Партыйна-камсамольская праслойка сярод прынятых 70,5 проц.

У падборы студэнтаў для гэтых навучальных устаноў рашаючую ролю адыграла работа студэнцкіх арганізацый.

Побач з посьпехамі ёсьць вялікія прарывы. Яўсэжцыя ўкамплектавана толькі на 50 проц. Яўінспэктура Наркамасьветы нічога не зрабіла ў галіне ўкамплектаваньня. БДУ і пэдінстытут нават ня маюць кіраўніка яўсэжцы. Інспэктура ўсё яшчэ «абцацае» даць кіраўніка яўсэжцы гэтых устаноў.

Недахват інтэрнатаў для студэнтаў новага набору пагражае зрывам нармальных заняткаў.

Патрэбны тэрміновыя захады з боку Наркамасьветы і інш. арганізацый, каб дапамагчы пераліченым навучальным установам ліквідаваць існуючыя прарывы, і забясьпечыць нармальны ход навучаньня.

В. РУДНІЦКІ.

НАМЕЦІЛІ... ПРАВЕСЬЦІ СХОД

Рад менскіх гарадзкіх і прыгарадных школ вельмі марудна перабудоўваюць сваю работу.

Ня гледзячы на тое, што прайшоў значны час пасьля апублікаваньня пастановы ЦК УсеКП(б), гарадзкая інспэктура і ўсе школы належнага пералому не зрабілі. Пакуль што толькі вызначана правесьці агульна-гарадзкі сход асьветнікаў, на якім будзе пастаўлена пытаньне аб распрацоўцы пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе.

Першыя дні вучобы паказваюць аб непадрыхтаванасьці раду школ да заняткаў.

Многія школы заняткаў не распачалі з-за адсутнасьці школьнай плошчы (31, 36, 35, 19, 40 і інш. школы) у той час, як на школьнай плошчы жывуць больш за 67 сем'яў.

Заняткі ў музычнай школе не пачаліся таму, што гарадзкі савет памяшканьне яе аддаў прамсаюзу, школа ж вымушана была зьмясьціцца ў падвале.

Да гэтага часу ні пры аднэй школе гораду не арганізавана грамадзкае харчаваньне. А пры 12-ці школах адсутнічаюць сталоўкі.

Закуплена ўсяго 3 тыс. пар абутку, а патрэбна 18 тыс. пар. Апалу ні ў аднэй школе яшчэ не загатоўлена. Ёсьць рэальная пагроза зрыву гарачых сьнеданьняў.

Яшчэ горшая справа ў прыгарадных школах. 36 школ ня скончылі рамонту. Ня выконваецца дырэктыва вышэйшых органаў аб адводзе кулацкіх памяшканьняў пад школы (Самахвалавіцкі, Кайкаўскі, Строчыцкі сельсаветы). Настаўніца Русінаўскай школы ня мае кватэры, вымушана зьмяшчацца ў памяшканьні, дзе адбываюцца заняткі. Сельсавет лічыць непатрэбным займацца гэтым пытаньнем.

Як на горадзе, а таксама і ў прыгарадных школах асабліваго пералому ў бок палітэхнізацыі няма. Гэтае пытаньне ўсё яшчэ вывучаецца. Для паляпшэньня гэтай справы гарадзкім інспэктарытам нарасьветы праведзены дэкадныя курсы настаўнікаў. Апрача таго інжынэры гор. Менску ўзялі на сябе абавязацельствы дапамагчы настаўнікам больш падрабязна вывучыць складаныя працэсы вытворчасьці.

Язэп К—к.

Палітэхнізацыя навыварат

МАГІЛЕЎ. У Магілеўскім палітасьветным тэхнікуме абвешчан двухмесячнік палітэхнізацыі, але для сапраўднага яе правядзеньня нічога ня робіцца.

Палітасьветны тэхнікум прымацаваны да наступных прадпрыемстваў: заводу «Чырвоны адрадзэнец», гарбарні імя Сталіна і шыйнай фабрыкі імя Валадарскага. Студэнтаў прымушаюць выконваць выключна чорную работу: насіць скуру, жалеза і інш. Машыны і варштаты яны здалёк бачаць.

Адміністрацыйны пэрсанал абсалютна ня ўсьвядоміў сутнасьці палітэхнізацыі. Таму кіраўнікі прадпрыемстваў заяўляюць: «рабеце тое, што мы вам загадаем».

Тэарытычныя прадметы (хэмія, матэматыка і інш.) зусім зжыты. Загадчык навучальнай часткі Ларычкін складае свае «праграму», якая абсалютна ня мае нічога супольнага з палітэхнічным навучаньнем.

Падольскі і Шульга.

Менгарсавет не разгарнуў масавай работы

Менскі гарком ЛКСМБ вылучыў 15 камсамольцаў для правядзеньня справаздачнай работы сярод рабочых вытворчасьці па пытаньнях падрыхтоўкі да манэўраў СПА, але гэтыя 15 чалавек жывы і да сёньня ня працы не прыступілі і знайсьці іх ніяк нельга.

Адстае таксама і гарсавет, якому даручана выдаць памятку рабочаму ў часе манэўраў СПА. Да гэтага часу памятка ня выдана. Ня выпушчаны масавыя плякаты і лёзунгі да манэўраў.

Узмацніць

РАБОТУ ЯЧЭЕК САДЗЕЙНАСЬЦІ ЭКСПАРТУ

Адной з форм і мэтадаў прыцягненьня і ўцягваньня ўсёй рабочай масы на прадпрыемствах і шырокай грамадзкасьці ў калгасах і саўгасах на барацьбу за выкананьне экспартнага пляна-вага заданьня — зьяўляецца арганізацыя на прадпрыемствах, што працуюць на экспарт, а таксама ў калгасах і саўгасах, ячэек садзейнасьці экспарту.

На жаль, на радзе фабрык і заводаў, якія працуюць на экспарт, ячэйкі садзейнасьці экспарту існуюць толькі на паперы і фактычна ніякай работы не вядуць.

Ёсьць шмат калгасаў і саўгасаў, дзе ячэйкі садзейнасьці экспарту зусім не арганізаваны. Між тым, ячэйкі садзейнасьці экспарту павінны быць тым арганізуючым зьвяном, пры дапамозе якога мабілізуецца і ўключаецца ў барацьбу за выкананьне экспартнага пляну як па колькасьці, так і па якасьці, уся рабочая маса, уся грамадзкасьць.

Мабілізацыя шырокай грамадзкасьці, прыцягненьне і ўключэньне ўсёй рабочай, калгаснай і саўгаснай масы ў сапраўдную штодзенную барацьбу за выкананьне экспартнага пляну — тым больш неабходны, што іменна тут, у нізах стварэюцца экспартныя рэсурсы, складаецца кошт экспарту, выкоўваецца якасьць і г. д.

Трэба памятаць, што іменна на прадпрыемстве, заводзе, у калгасе, саўгасе, дзе загатаўляюцца і выпрацоўваюцца с.-г. і прамысловыя прадукты вырабляюцца ў значнай меры колькасныя і якасныя паказальнікі нашага экспарту.

Задача ячэйкі садзейнасьці экспарту ў першую чэргу заключаецца ў папулярызацыі ролі і значэньня экспарту ў справе сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і сапраўднай мабілізацыі ўвагі вакол выкананьня экспартнага пляну па сваім прадпрыемстве.

Ня гледзячы на тое, што многія арганізацыі гаворадь аб важнасьці заготоўкі другарадных відаў сыр'ю экспарту на ўцілі-рыньвё, прам-адыходы, поті і капыты, лектохсырэц, пух-пер'е і г. д., аб вялікіх магчымасьцях у гэтай справе, — да гэтага часу загатоўцы другарадных відаў сыр'ю не аддала патрэбнай практычнай увагі; па-ранейшаму на гэту работу гляджаць, як на нешта дзесяцярыднае, ня маючае вялікага значэньня. Зрыў загатоўкі рознага экспарту — гэта зрыў выкананьня нашых агульных экспартных праграм. З недаацэнкай рознага экспарту трэба суў'язна і рашуча змагацца. Ёсьць магчымасьць, але няма ініцыятывы. Тут шырокае поле дзейнасьці для ячэек садзейнасьці экспарту ў калгасах і саўгасах, каб прарыў у выкананьні пляну загатовак другарадных відаў сыр'ю ў першым паўгодзьдзі быў-бы пераарыт у другім паўгодзьдзі.

Ячэйкі садзейнасьці экспарту павінны сачыць і ў штодзённай рабоце забясьпечыць давядзеньне пляну загатовак, вытворства, перапрацоўкі, адгрузкі непасрэдна да цэху, агрэгату, варштату, брыгады і пасобнага работніка.

Уцягваючы шырокую грамадзкасьць практычна і канкрэтна ў справу выкананьня экспартнага пляну, ячэйкі садзейнасьці экспарту павінны арганізаваць штодзённую барацьбу за паляпшэньне якасьці прадукцыі, рацыяналізацыю вытворчасьці, зьніжэньне сабекошту і накладных выдаткоў і г. д.

Не павінна быць ніводнага прадпрыемства, калгасу, саўгасу, дзе ячэйка садзейнасьці экспарту не працавала-б па сапраўднаму, па-баявому. Толькі шляхам шырокай мабілізацыі грамадзкай увагі вакол экспарту, шляхам уцягненьня ўсёй рабочай масы і шырокай калгаснай і саўгаснай грамадзкасьці, мы забясьпечым выкананьне экспартнага пляну як па кожным прадпрыемстве, раёне, калгасе, саўгасе, так і па БССР у цэлым.

Рэдэр.

Манэўры--магутны сродак

сувязі Чырвонай Армії з працоўным насельніцтвам

Разгарнуць сацспаборніцтва ў арганізацыях Асоавіяхіму вакол падрыхтоўкі да манэўраў

Манэўры Чырвонай арміі, набываюць вялікае палітычнае значэньне. На манэўрах гэтага году Чырвоная армія пакажа і замацуе дасягненьні летняй вучобы.

Наша палітыка — ёсьць палітыка міру, якую мы праводзім і будзем праводзіць і далей усімі сіламі і сродкамі. Мы вайны ня хочам, але павінны быць заўсёды гатовы даць руйнуючы адпор таму хто адважыцца на нас напасьці. Манэўры—гэта важнейшы этап вучобы. Чырвоная армія ў часе манэўраў правярае на практыцы сваю тактычную і тэхнічную падрыхтаванасьць, удасканальвае формы і мэтады палітычнай работы.

ВЯЛІКІЯ І АДКАЗНЫЯ ЗАДАЧЫ Ў ГАЛІНЕ САДЗЕЙНАСЬЦІ ЧАСЬЦЯМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў ЧАСЕ МАНЭЎРАЎ УСКЛАДАЮЦЦА НА АРГАНІЗАЦЫЮ АСОАВІЯХІМ. Асоавіяхім павінен мабілізаваць усе свае сілы і ўвагу вакол манэўраў РСЧА.

У абавязак кожнага працоўнага і, у першую чаргу, члена Асоавіяхіму ўваходзіць — абкружыць найбольшай увагай таварыскімі клопатамі часьці Чырвонай арміі, якія прымаюць удзел у манэўрах, усямерна дапамагаць ім у выкананьні іх заданьняў.

Усе арганізацыі і ячэйкі Асоавіяхіму, асабліва тых раёнаў, дзе будуць праходзіць манэўры, павінны поўнасьцю мабілізавацца на дапамогу Чырвонай арміі.

Кожная ячэйка Асоавіяхіму павінна арганізаваць сустрачы, вечары змычкі з часьцямі Чырвонай арміі, ператварыць манэўры ў сьвята яднаньня працоўных з Чырвонай арміяй.

Трэба зараз-жа склясьці пляны работы ячэек асоавіяхіму на час манэўраў РСЧА, расставіць сілы, указаць кожнаму члену яго абавязкі ў часе манэўраў. У парыяд да манэўраў трэба разгарнуць МАСАВУЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА АБ МІЖНАРОДНЫМ І ЎНУТРАНЫМ СТАНОВІШЧЫ СССР, аб задачах манэўраў РСЧА і дапамозе Чырвонай арміі.

У часе манэўраў неабходна арганізаваць гутаркі, мітынгі з насельніцтвам і чырвонаармейцамі, павесьці растлумачальную работу аб тым, што толькі пры ўмове цеснай сувязі Чырвонай арміі з працоўнымі можа быць дасягнута перамога ў будучых баях з буржуазіяй.

Класавы вораг будзе імкнуцца да таго, каб пахіснуць маральную ўстойлівасьць нашых байцоў, пасеяць варожасьць паміж працоўнымі і чырвонаармейцамі, распаўсюджваючы розныя чуткі і хлусьню аб тым, што, нібы, пачалася вайна і г. д. Задача асоавіяхімаўцаў — выкрыць майўры клясавага ворага і рашуча перасякаць усякую спробу кулака перашкодзіць нашаму сацбудаўніцтву.

Манэўры павінны зьявіцца штуршком у ажыўленьні ўсёй асоавіяхімаўскай работы. Трэба арганізаваць ПРАВЕРКУ РАБОТЫ ячэек Асоавіяхіму ў часе манэўраў, павесьці шырокую растлумачальную работу аб ролі і задачах таварыства Асоавіяхім, ліквідаваць запазычанасьць па членскіх узносах, павесьці збор сродкаў на дырыжаблябудаўніцтва, разгарнуць вярбоўку новых членаў у Асоавіяхім, арганізаваць новыя і каладзіць работу існуючых вайсковых гурткоў. Ва ўсёй асоавіяхімаўскай работе павінен быць забясьпечаны пералом у бок яшчэ большага ажыўленьня і паляпшэньня якасьці абаронай працы.

Адначасова з дапамогай манэўрам, трэба яшчэ больш напружана павесьці работу вакол пытаньняў ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ЧАРГОВЫХ ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ. Датэрміновае і пасьпяховае скончаньне ўборачнай і асеньняй пасеўкампаніі, арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, арганізацыя чырвоных абозаў, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну — усё гэта накладае вялікі абавязак і на арганізацыі Асоавіяхіму.

Толькі на аснове САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА, шляхам арганізацыі ЎДАРНЫХ АСОАВІЯХІМАЎСКІ БРЫГАД, мы з посьпехам выканаем тыя задачы, якія пастаўлены перад арганізацыямі Асоавіяхіму на час манэўраў.

Трэба памятаць што кожны асоавіяхімавец - перадавы баец у справе абароны сацыялістычнага будаўніцтва.

СКУРАНТ.

Вытрымаць экзамэн

Небясьпека ваеннага нападу на СССР узрастае. Аб гэтым сьведчыць уся міжнародная абстаноўка — апошнія пасяджэньні жэнэўскай канфэрэнцыі ў соты раз выкрылі тэндэнцыі капіталістычнага сьвету да новых войнаў, у першую чаргу, да ўзброенага нападу на СССР.

Вайна будзе весьціся ня толькі на фронце, але і ў тыле. Вайна будзе весьціся перш за ўсё сіламі паветранага флёту, шляхам ськіданьня бомбаў, напоўненых выбуховымі, атрутнымі і запальваючымі матэрыямі.

Паветраны флёт праціўніка нападзе раней за ўсё на гарады, на заводзкія і фабрычныя аб'екты.

НАШ ТЫЛ ПАВІНЕН БЫЦЬ ГАТОВЫМ ДА СПА.

Пралетарыят Менску будзе ў хуткім часе трымаць экзамэн на гатоўнасьць да абароны гораду ад паветранага праціўніка.

Праверка павінна выявіць:

1. Наколькі пралетары Менску аўладалі элемэнтарнымі ведамі па СПА і як яны іх будуць выконваць на манэўрах.

2. Згуртаванасьць камандаў СПА, іх своячасовую гатоўнасьць, разгортваньне практычнай работы, веданьне сваіх функцый

3. Забясьпечыць бесьперабойную і нармальную работу ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў гораду.

4. Дысцыпліназанасьць насельніцтва.

5 Ступень ахопу насельніцтва растлумачальнай работай аб значэньні і задачах манэўраў СПА; практычны ўдзел у правядзеньні манэўраў.

6. Барацьбу з магчымымі варожымі чуткамі, антысавецкай агітацыяй, накіраванай да падрыву дысцыпліны і да невыкананьня абавязковых пастаноў і да зрыву бесьперебойнай работы прадпрыемстваў.

7. Ступень удзелу нашых партыйна-камсамольскіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый у мабілізацыі мас на правядзеньне манэўраў.

ГЭТЫ ЭКЗАМЭН ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН НА «ВЫДАТНА».

Манэўры СПА павінны павялічыць рады партыйна-камсамольскіх арганізацый і членаў Асоавіяхіму, ліквідаваць прарывы ў выкананьні прамфінпляну.

ЗАДАЧЫ МАНЭЎРАЎ ПАВІНЫ БЫЦЬ ВЫКАНАНЫ.

А. ЯХІМОВІЧ.

Жлобінскія чыгуначнікі рыхтуюцца

На Жлобінскім чыгуначным вузле разгорнута масавая падрыхтоўчая работа да надыходзячых манэўраў РСЧА. Сярод рабочых праводзяцца сходы, гутаркі і лекцыі з растлумачэньнем задач надыходзячых манэўраў РСЧА. Распрацоўваюцца канкрэтныя меры па паляпшэньні шэфскай работы і дапамозе Чырвонай арміі.

МАШНІЦКІ.

Вучэньне па сьвета-маскаваньні

16 верасьня ў 22 гадзіны будзе праводзіцца вучэньне па сьветамаскаваньні.

У пачатку вучэньня будзе дан сыгнал «паветранай трывогі», які зьявіцца пачаткам вучэньня.

Вучэньне па сьвета-маскаваньні будзе працягвацца да сыгналу «адбой». Пасьля сыгналу «паветраная трывога» трэба ўжыць усе меры, якія забясьпечваюць запамянёньне гораду:

1. Вулічныя ліхтары выключаюцца Эльводам.

2. Знадворныя лямпачкі ля дамоў выключаюцца па распараджэньні старшынь жаўтаў.

3. На прадпрыемствах і ўстановах выключэньне сьвятла праводзіцца распараджэньнем дырэктароў прадпрыемстваў. Усяму насельніцтву забараняецца запальваць сьвятло, калі вокны ня будуць завешаны сьвета-непрапускальнымі шторамі.

За невыкананьне гэтых указаньняў асобы будуць прыцягвацца да адказнасьці, згодна абавязковай пастанове Менгарсавету ад 12 верасьня.

Збор рабочых па сыгналу 16 верасьня не рабіць.

Начальнік штабу пункту СПА
Грамыка.

Завод „Бальшавік" проводзіць вытворчыя манэўры

Надыходзяць манэўры РСЧА. Манэўры — гэта генэральная праверка нашай гатоўнасьці да абароны савецкай краіны. У часе манэўраў рабочыя заводу «Бальшавік» павінны праверыць сваю баявую падрыхтоўку да абароны краіны і яшчэ больш згуртаваць свае рады на лепшае выкананьне задач па гаспадарчым будаўніцтве, на датэрміновае перавыкананьне пляну трэцяга кварталу.

У сувязі з надыходзячымі манэўрамі Чырвонай арміі «Бальшавік» абвяшчае па заводзе вытворчыя манэўры, паставіўшы перад сабой наступныя задачы:

1. Датэрміновае выкананьне і перавыкананьне пляну трэцяга кварталу трэцяга рашаючага году.

2. Падрыхтоўка сустрэчнага прамфінпляну чацьвертага кварталу і апошняга году пяцігодкі.

3. Павысіць тэмпы ходу канвэеру якасьці, дабіцца рэзкага паляпшэньня якасьці прадукцыі; праверыць выкананьне ўзятых заводам абавязацельстваў па канвэеры якасьці і правесьці рэйд па праверцы разгортваньня канвэеру.

4. Замацаваць і разьвіць вопыт зьменна-сустрэчных плянаў і 10-ціхвілінных вытворчых нарад. Вытворчыя нарады і зьменна-сустрэчныя пляны праводзіць штодзенна, на ўсіх брыгадах, якія налічваюць ня менш 5 рабочых.

5. Праверыць работу партыйных груп пад кутом погляду выкананьня аспоўных задач, пастаўленых у прамове тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў і на вярбоўцы лепшых ударнікаў у партыю.

6. Праверыць работу Асоавіяхіму па ўсіх цэхах пад кутом погляду паляпшэньня валізацыі рабочых заводу, дапамогі ў ўдзелу ў надыходзячых манэўрах Чырвонай арміі, дапамогі ў выкананьні вытворчых задач заводу, 100-процантнага ўдзелу камандны ў манэўрах СПА, і ў вайсковых занятках.

7. Праверыць работу ячэйкі МОПР'у пад кутом погляду маральнага і матар'яльнага падтрыманьня палітзьняволеных Польшчы, навароту ячэйкі МОПР'у да выкананьня вытворчых задач заводу.

8. Праверыць прафэсыянальную работу ў галіне наваротку тварам да вытворчасьці і паляпшэньня культурна-бытовога абслугоўваньня рабочых.

9. Праверыць выкананьне калектыўнага дагавору.

10. Праверыць падрыхтоўку да новага навучальнага году, да партвучобы, да разгортваньня на заводзе сыстэмы тэхнічнай адукацыі рабочых. Гэту праверку правесьці пад лёзунгам: «8-я гадзіна — для тэхнічнай адукацыі», «ніводнага партыйца, камсамольца і ўдарніка — па-за вучобай».

11. Дапамагчы падшэфным сельсаветам у правядзеньні ўборачнай кампаніі, асеньняй сяўбы і зяблёва, на ўкараненьні зьдзельшчыны і наладжваньні ўліку, у ліквідацыі ўраўнілаўкі і абзяльчкі ў калгасах. Лепшаму падшэфнаму сельсавету будзе перададзены заводзкі пераходны сьцяг.

12. Праверыць работу ЗРК у галіне лепшага абслугоўваньня і забясьпечэньня рабочых дрывамі, гародніной і прамтаварамі, палепшыць работу заводзкай сталоўкі.

13. Праверыць укараненьне сапміні-мум на заводзе, пасёлку, кватэрах рабочых, правесьці

ЧЫРВОНАЙ АРМІІ— ПОЎНАЦЭННАЕ ПАПАЎНЕНЬНЕ

Выкарыстаць вопыт „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ"

АГЛЯД ДРУКУ

Прызыў **ПАЧАЎСЯ.** У рады Чырвонай арміі ідзе новае папаўненьне. Ідуць ударнікі заводаў і фабрык, саўгасаў і калгасаў. З 15 верасьня прыступілі да работы прызыўныя пункты ў раёнах.

Прызыўная кампанія праходзіць пад знакам высокай палітычнай актыўнасьці прызыўнікоў. У радзе раёнаў у дзень прызыву калгасы арганізавалі масавыя чырвоныя абозы са збожжам. Многія раённыя канфэрэнцыі прызыўнікоў абвясьцілі сябе ўдарнымі на выкананьне задач, якія стаяць перад прызывам.

Пачатак прызыву, аднак, ні ў якім разе не азначае, што можна аслабіць тэмпы падрыхтоўчай работы. Гэта тым больш неабходна падкрэсьліць, што ў праведзенай падрыхтоўцы да прызыву ЁСЬЦЬ ІСТОТНЫЯ НЕДАХОПЫ. У радзе раёнаў зусім нездавальняюча праведзен сацыяльна-клясавы адбор прызыўнікоў. На многіх прадпрыемствах і ў сельсаветах ліквідацыя няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў і да сёньняшняга дня НЯ СКОНЧАНА.

Зараз прызыў уступіў у САМУЮ АДКАЗНУЮ ПАЛАСУ. Зараз неабходна, ня трацячы ні аднэй хвіліны, на хаду ліквідаваць усе недахопы ў падрыхтоўчай рабоце, каб забясьпечыць поўнае і своячасовае выкананьне задач прызыву.

У сувязі з гэтым адказнасьць друку за пасьпяховае правядзеньне прызыву ў рады РСЧА ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА. Як центральныя, так і раённыя газэты БССР павінны рашуча ўзмацніць сваю барацьбу за поўнае, палітычна падрыхтаванае папаўненьне для Чырвонай арміі.

Друк павінен забясьпечыць выразную работу прызыўных пунктаў пры непасрэдным удзеле ўсіх партыйных, камсамольскіх і прасавых арганізацый.

* * *

«Рэвваенсавет акругі са здаваленьнем адзначае вашу работу па прызыве.

Вашаму прыкладу павінны пасьледаваць усе раённыя газэты БССР і «Большевистский молодняк» Захабкому.

Бальшавіцкім мэтадам змагайцеся за клясава-адданага прызыўніка — ударніка заводу і калгасу, за саракапроцантную камсамольскую праслойку прызыву.

Камандуючы войскамі ЗОНБЭРГ.
Член Рэвваенсавету КОРАБАЎ».

Так ахарактарызаваў у сваёй тэлеграме на імя рэдакцыі «ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЫ» Рэвваенсавет БВА работу газэты па падрыхтоўцы да прызыву.

Гэту характарыстыку «Ч. З.» заслужыла, разгортваючы сыстэматычную і глыбокую апэрацыйна-масавую работу вакол прызыву ў рады Чырвонай арміі. Прагляд камплектаў «Ч. З.» паказвае, што газэта ЗДОЛЕЛА прыкаваць увагу камсамольскіх мас да барацьбы за поўнацэннае папаўненьне для РСЧА.

Амаль в нумару ў нумар «Ч. З.» дае разгорнутыя матар'ялы па ўсіх рашаючых вучастках прызыўной кампаніі. Асаблівая заслуга газэты ў тым, што яна фактычна САМАЙ ПЕРШАЙ з усіх газэт БССР разгарнула масавую, апэрацыйна-арганізатарскую работу па пытаньнях прызыву.

«Чырвоная Зьмена» адразу ўзяла курс на практычную рэалізацыю пастаноў ЦК ЛКСМБ аб прызыве, праводзячы ўсю работу пад лёзунгам «За клясава адданага прызыўніка з заводу і калгасу, за саракапроцантную камсамольскую праслойку прызыву».

Пад гэтым лёзунгам газэта і разгортвала абвешчаны ёю паход за выкананьне ўсіх задач, якія стаяць перад чарговым прызывам у рады РСЧА.

На старонках «Ч. З.» сыстэматычна зьмяшчаліся канкрэтныя рапарты камсамольскіх арганізацый аб праведзенай рабоце. Газэта выяўляла слабыя месцы падрыхтоўкі, біла па канкрэтных прычынах прарываў, папулярызуючы разам з тым лепшыя прыклады работы.

Мэтады ўцягненьня мас у паход за поўнацэннае папаўненьне для РСЧА «Ч. З.» ужывала жывыя, апэрацыйныя, мэтаімклівыя. Правільна ацаніўшы ўсю важнасьць непасрэднага ўдзелу пісьменьніцкіх і мастацкіх сіл у падрыхтоўчай рабоце, «Ч. З.» кінула выклік усім рабселькорам, пісьменьнікам і мастаком, прад'явіўшы ім «чырвона-зьменаўскі рахунак»:

«Выходзьце ў паход. Вы яшчэ не далі таго, што можаце і павінны даць Чырвонай арміі».

Газэта ДАБІЛАСЯ, каб яе заклік не застаўся пустым гукам. 31 жніўня «Ч.З.» зьмяшчае першыя літаратурныя матар'ялы пісьменьнікаў, якія «мабілізаваліся на аплату «чырвона-зьменаўскага рахунку».

Сіламі сваіх ударных брыгад «Ч. З.» арганізавала рэйды па праверцы падрыхтоўкі да прызыву і потым уважліва сачыла, каб усе пытаньні, узьнятыя ўдзельнікамі рэйдаў, былі ацэнены на справе.

Адзін з такіх рэйдаў газэта правяла, напрыклад, пачынаючы з 1 жніўня, загадзя выпрацаваўшы канкрэтную практычную праграму:

«Камітэтам ЛКСМБ неабходна зараз-жа разгарнуць падрыхтоўку да рэйду. Неабходна правесьці гутаркі і нарады з юнкорамі і ўдарнікамі на тэму: «прызыў трэцяга рашаючага году і задачы камсамолу і юнкораў». Да падрыхтоўчай работы па рэйдзе трэба прыцягнуць райвенкаматы».

Потым газэта зусім правільна канцентрує ўвагу камсамольскіх арганізацый на лепшых прыкладах падрыхтоўкі да рэйду, дабіваючыся, каб рэйд стаў непасрэдная справай мас.

«Ч. З.», напрыклад, шырока асьвятліла вопыт работы клімавіцкіх арганізацый, дзе падрыхтоўка да прызыву праводзілася на аснове сацыялістычнага спаборніцтва, дзе ў падрыхтоўку ўключыліся ўсе партыйныя, камсамольскія і асьветніцкія сілы.

Напярэдадні прызыву газэта энэргічна выяўляе недахопы ў падрыхтоўцы, паставіўшы сваёй мэтай дабіцца іх неадкладнай ліквідацыі.

І зараз, у дні прызыву, «Чырвоная Зьмена» НЕ АСЛАБЛЯЕ сваёй увагі да прызыўной кампаніі, кінуўшы лёзунг «у дні прызыву — павышаць тэмпы паходу».

Варта адзначыць каштоўную ініцыятыву «Чырвонай Зьмены» па арганізацыі супольнай работы з іншымі газэтамі. Разгортваючы работу вакол прызыўной кампаніі, газэта выклікала, на сацыялістычнае спаборніцтва орган Заходняга абласткому УсеЛКСМ газэту «БОЛЬШЕВИСТСКИЙ МОЛОДНЯК». «Большевистский молодняк» на выклік «Ч. З.» НЕ АДКАЗАЎ. І тут заслуга «Ч. З.» іменна ў тым, што яна дабілася, каб яе выклік прынёс адпаведныя вынікі. У радзе матар'ялаў «Ч. З.»

ЗПАР ПланСкан А2В

9.000 рабочых—Данбасу

Чырвонапольскі, Кармянскі, Бярэзінскі і Бялыніцкі раёны

ПРЭМІЯВАНЫ

ЯНЫ ПЕРШЫМІ ВЫКАНАЛІ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ

Рэчыцкі, Глускі, Мсьціслаўскі, Талачынскі, Прапойскі і Буда-Кашалёўскі раёны ганебна плятуцца ў хвасьце

На чорную дошку зрыўшчыкаў арганізаванай вярбоўкі рабсілы для Данбасу!

Учора цэнтральная камісія садзейнасьці арганізаванай вярбоўцы рабочых для Данбасу, абгаварыўшы першыя вынікі ходу вярбоўкі, пастанавіла:

прэміяваць лепшыя раёны, якія датэрмінова выканалі і перавыканалі кантрольныя лічбы вярбоўкі рабсілы для Данбасу. Раёны гэтыя наступныя:

	ЗАДАНЬНЕ	ВЫКАНАНА	
Чырвонапольскі — —	250	250	(вярбоўка працягваецца)
Кармянскій — —	100	106	(раней даў 48 чал.).
Бярэзінскі — — —	126	135	
Бялыніцкі — — —	150	150	

Лепшыя раёны прэміяваны

Чырвонапольскі — — — —	на суму	1000 руб.
Кармянскі — — — — —	на суму	750 руб.
Бярэзінскі — — — — —	на суму	500 руб.
Бялыніцкі — — — — —	на суму	500 руб.

Гроші накіроўваюцца ў распараджэньне раённых камісій садзейнасьці арганізаванай вярбоўцы рабсілы для Данецкага пралетарыяту для прэміяваньня лепшых калгасаў, сельсаветаў і грамадзкіх вярбоўшчыкаў.

Далей камісія адзначыла, што кандыдатамі на прэміяваньне зьяўляюцца:

	ЗАДАНЬНЕ	ВЫКАНАНЬНЕ
Лепельскі раён — —	150	110
Плешчаніцкі раён — —	160	97
Хойніцкі раён — —	300	158
Касьцюковіцкі раён —	350 (сустр. 720)	253

Ганебна плятуцца ў хвасьце

	ЗАДАНЬНЕ	ВЫКАНАНЬНЕ
Рачыцкі раён — — —	200	27
Глускі раён — — —	320	25
Мсьціслаўскі раён — —	200	24
Талачынскі раён — —	200	23
Прапойскі раён — —	250	8
Буда-Кашалёўскі раён —	240	— ніводнага

Лічачы такія адносіны да важнейшага гаспадарча-палітычнага пытаньня злачынна-нядбайнымі, «Зьвязда» заносіць гэтыя апошнія шэсьць раёнаў на чорную дошку і патрабуе ад пракурора рэспублікі неадкладна вывіць вінаватых і прыцягнуць іх да судовай адказнасьці.

Усебеларускі конкурс на лепшыя калгасныя фэрмы

БУЛЬБЯНІК і БАТВУ—Ў СІЛАСНЫЯ ЯМЫ

Вялізарную масу бульбяніка і батвы ператварыць у каштоўны і сакавіты корм—баявая задача жывёлагадоўчых гаспадарак

Калгас „Батрак", які перавыканаў план сіласаваньня—прыклад усім калгасам БССР

БУЛЬБЯНІК ПЕРАСЬПЕЎ...

...а сіласныя ямы пустыя

Па БССР засеяна 566.464 гэкт. бульбы. У калгасах і аднаасобным сэктары засеяна 550.517 і ў саўгасах 15.947 гэкт. На ўсёй гэтай плошчы ёсьць вялізарная маса бульбяніку, які з вялікім посьпехам можа і павінен быць закладзен у сіласныя ямы і траншэі.

Поўнае выкарыстаньне гэтай масы для сіласу—неадкладная і баявая задача саўгасаў, калгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У паўднёвых раёнах ужо пачалася ўборка бульбы. Аднак, бульбянік, як зялёная маса для сіласу, не выкарыстоўваецца.

Аб гэтым з поўнай яркасьцю гавораць факты з Чырвона-Слабодзкага раёну. Так, у калгасе „Чырвоны Пуцілавец" яшчэ ня скончана падрыхтоўка сіласнай ямы, а бульбянік ужо пачынае чарнець і траціць сваю каштоўнасьць. Такое-ж становішча і ў калгасе «Беларуская Вёска» таго-ж раёну.

Трэба неадкладна скарыстаць бульбянік для сіласу. Камсамольскія ячэйкі ў калгасах і саўгасах павінны зьявіцца ініцыятарамі гэтага мерапрыемства і разгарнуць барацьбу за поўнае выкананьне праграмы ў 1.000.000 тон сіласу.

Заданьне рэальна, яно павінна быць выканана

І кастрычніка надыходзіць апошні тэрмін сіласаваньня па БССР. Ня гледзячы на тое, што засталося ўсяго 15 дзён, тэмпы выкананьня пляну ўсё яшчэ застаюцца ганебна мізэрнымі. На 10 верасьня плян сіласнага будаўніцтва па БССР выкананы усяго на 25,2 проц., а плян сіласаваньня — на 12,4 проц.

Усё яшчэ не ліквідаваны разрыў паміж выкананьнем пляну будаўніцтва і самім сіласаваньнем. Значная колькасьць сіласных ям і траншэй, скончаных абсталяваньнем, УСЁ ЯШЧЭ ПУСТУЮЦЬ, ня гледзячы на тое, што зялёнай масы для закладкі сіласу ёсьць у выстарчальнай колькасьці.

У паасобных раёнах разрыў паміж выкананьнем сіласнага будаўніцтва і сіласаваньнем дасягае значных разьмераў. Так, напрыклад, СЕНЬНЕНСКІ раён плян сіласнага будаўніцтва выканаў на 69 проц., засіласавана-ж толькі 16 проц. ТАЛАЧЫНСКІ раён будаўніцтва выканаў на 62 проц., а сіласаваньне — на 17 проц. Такое становішча і ў ПЛЕШЧАНІЦКІМ раёне.

Рэкорд пабіў БЯРЭЗІНСКІ раён дае сіласнае будаўніцтва выкананым на 46 ПРОЦАНТАЎ. Але сіласныя вежы, ямы і траншэі пустуюць — сіласаваньне выкананым толькі ў разьмеры 0,2 проц.

Толькі некалькі раёнаў дабіліся некаторага зруху ў выкананьні пляну сіласаваньня — гэта СІРОЦІНСКІ раён—35 процантаў пляну, СУРАСКІ—31 проц., КЛІМАВІЦКІ і ЧАЧЭРСКІ—па 30 проц.

Раённыя арганізацыі, даўшы дырэктыву аб сіласаваньні, не паклапаціліся праверыць, як гэтыя дырэктывы праводзяцца ў жыцьцё. Дагэтуль ня зломлены апартуністычныя адносіны да сіласаваньня, усё яшчэ ідуць разважаньні аб тым, што «сілас не патрэбен, кармоў хопіць і бяз сіласу, сіласаваньне—марная трата часу».

Гэтыя апартуністычныя разважаньні не атрымліваюць яшчэ адпаведнага адпору з боку раённых арганізацый.

Час, які застаўся, трэба зараз максымальна скарыстаць для выкананьня пляну сіласаваньня.

Практыка перадавых калгасаў, якія ўжо выканалі і перавыканалі пляны сіласаваньня, паказвае, што заданьне партыі і ўраду ЗУСІМ РЭАЛЬНАЕ.

Кожны саўгас і калгас павінны заразжа ўсю вольную рабочую сілу перакінуць на сіласаваньне. Трэба безадкладна ліквідаваць разрыў паміж сіласным будаўніцтвам і закладкай сіласнай масы.

БУЛЬБЯНІК І БАЦЬВІНЬНЕ, ЯКІЯ ЎЖО ПАСЬПЕЛІ — НЕАДКЛАДНА Ў СІЛАСНЫЯ ЯМЫ.

Перамога „Батрака"

ЦК КП(б)Б, НАРКАМЗЕМУ БССР, БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ І ГАЗЭЦЕ «ЗЬВЯЗДА».

МЫ, КАЛГАСЬНІКІ КАЛГАСУ «БАТРАК», МАБІЛІЗАВАЎШЫСЯ НА ВЫРАШЭНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ Ў РАЗЬВІЦЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ, РАПАРТУЕМ АБ СВАІХ ПЕРАМОГАХ:

СЬВІНАТАВАРНАЯ ФЭРМА ЎКАМПЛЕКТАВАНА НА 80 ПРОЦ. ПАВОДЛЕ ПЛЯНУ ДА КАНЦА 1931 Г. ПАВІННА ВЫЙЦІ ПАСТАЎЛЕНА 200 СЬВІНАМАТАК, ЗАРАЗ ЕСЬЦЬ 160 І МАЛАДНЯКА-СЬВІНАК—51 ШТУКА, ШТО ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ДА ТЭРМІНУ. ПАСТАЎЛЕНА НА БЭКОН 36 ШТУК, А ЎСЯГО Ў КАЛГАСЕ 321 ШТ. ЗДАНА ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ СТАНДАРТНАЙ ЯКАСЬЦІ 47 ШТУК.

ПЛЯН СІЛАСАВАНЬНЯ ПЕРАВЫКАНАН. ТРЭБА ЗАСІЛАСАВАЦЬ 120 ТОН, ЗАСІЛАСАВАНА 135 ТОН. ЗМАГАЕМСЯ ЗА ДАЛЕЙШЫЯ ПОСЬПЕХІ Ў СІЛАСАВАНЬНІ.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БУДЗЕМ І НАДАЛЕЙ ЗМАГАЦЦА ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ПЕРАМОГІ Ў РАЗЬВІЦЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ КАРАКА.
САКРАТАР ПАРТ'ЯЧЭЙКІ ЗІНЬКОВІЧ.
САКРАТАР ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ КАБЕЛЬ.
ЗАГ. СЬВІНАТАВАРНАЙ ФЭРМЫ ШПАКОЎСКІ.
УДАРНІЦА СІРАФІМОВІЧ.

Бярэце прыклад з Чырвонапольскага раёну

Вярбоўка рабочай сілы Данбасу па Чырвонапольскім раёне праходзіць здавальняюча. Паводле пляну на 15-IX трэба было паслаць 100 рабочых, між тым на 12-IX-1931 г. ужо адпраўлена 150 асоб.

Гэтыя дасягненьні мы маем дзякуючы таму, што раённыя арганізацыі надалі палітычны характар гэтаму пытаньню.

Райпрафсавет Шыфрын.
Райінспэкцыя працы Крычавец.

Швэдка парваў пуцёўкі

ТАЛАЧЫН. У РАЁНЕ НА 15 ВЕРАСЬНЯ ЗАВЕРБАВАНА 71 ЧАЛАВЕК, З ІХ АДПРАЎЛЕНА 23. РАЁН ПАВІНЕН ДАЦЬ ДАНБАСУ 200 ЧАЛАВЕК.

САКРАТАР ПАРТ'ЯЧЭЙКІ ВОЛКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ САСНОЎСКАЯ ІГНАРУЕ ВЯРБОЎКУ. НА БЮРО ЯЧЭЙКІ БЫЛА ВЫНЕСЕНА ПАСТАНОВА МАБІЛІЗАВАЦЬ НЕКАЛЬКІ ПАРТЫЙЦАЎ ДЛЯ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ ПА ВЯРБОЎЦЫ. АДНАК, ГЭТА ЗАСТАЛОСЯ ТОЛЬКІ НА ПАПЕРЫ.

РАЙКОМ ЛКСМБ ВЫЛУЧЫЎ У ДАПАМОГУ ВЯРБОЎЦЫ ТРОХ КАМСАМОЛЬЦАЎ, ЯКІЯ ПРАЗ ДЗЕНЬ ДЭЗАРТЫРАВАЛІ З РАЁНУ. ДА ГЭТАГА ЧАСУ НІЯКІХ ПАКАРАНЬНЯЎ ЯНЫ НЕ АТРЫМАЛІ.

КАЛГАС ІМЯ МОЛАТАВА, СЛАВЕНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ВЫЛУЧЫЎ У ДАНБАС ДВУХ КАЛГАСЬНІКАЎ, ЯКІЯ З ПУЦЁЎКАЙ КАЛГАСУ ЗЬЯВІЛІСЯ Ў СЕЛЬСАВЕТ. ШВЭДКА—СТАРШЫНЯ СЕЛЬСАВЕТУ ГЭТЫЯ ПУЦЁЎКІ ПАРВАЎ, ГАВОРАЧЫ, ШТО «МНЕ САМОМУ ПАТРЭБНЫ ЛЮДЗІ».

РАЙАРГАНІЗАЦЫІ ШЛЯХАМ МАСАВАЙ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ ПАВІННЫ ЗЬНІШЧЫЦЬ ТАКІЯ ЗЬЯВІШЧЫ.

Ударыць па галавацяпах

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. Касьцюковіцкі раён ня выконвае свайго сустрэчнага. Замест 350 гарнякоў накіравана ў Данбас толькі 105.

Старшыня Вялікаборснага сельсавету Макавеў не дае адыходнікам даведак. Старшыня праўленьня калгасу «Зветы Леніна» Каплуноў катэгарычна адмовіўся адпусьціць старых гарнякоў у кольскасьці 13 чалавек. Калі разьмяркоўвалі ў гэтым калгасе муку, дык адыходнікам не дадавалі паловы, кажучы, што: «Калі не паедзеш у Данбас, тады другую палову атрымаеш». Сакратар ячэйкі КП(б)Б калгасу «Зветы Леніна» заявіў на сходзе: «Калі хто паедзе ў Данбас—сем'і іх будуць выключаны з калгасаў».

Трэба ўжыць суровыя меры ў адносінах да такіх зрыўшчыкаў вярбоўкі гарнякоў для Данбасу.

ЗРУХ ЁСЬЦЬ, АЛЕ ЗУСІМ НЕВЫСТАРЧАЛЬКІ

На 15-IX паслана ў Данбас

3.164 рабочых

або 35 проц.

заданьня III кварталу—

УЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ ВЯРБОЎКІ!

Адказ калгасьнікаў на бязьдзейнасьць бюракратаў

НАРОЎЛЯ. ПА НАРАЎЛЯНСКІМ РАЁНЕ ВЯРБОЎКА РАБОЧЫХ У ДАНБАС РАСПАЧАЛАСЯ З 2 ВЕРАСЬНЯ. ДЗЯКУЮЧЫ ШЫРОКАЙ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОЦЕ, КУЛАЦКАЯ АГІТАЦЫЯ АБ ТЫМ, ШТО Ў ДАНБАСЕ ГОЛАД, І ІНШ. БЫЛА РАЗЬБІТА. ЗА ДЗКАДУ ЗАВЕРБАВАНА І ПАСЫЛАЕЦЦА Ў ДАНБАС 100 РАБОЧЫХ. ПА АДНЫМ ВЕРБАВІЦКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ ЗАВЕРБАВАНА 60 АСОБ.

АЛЕ НЕКАТОРЫЯ РАБОТНІКІ СЕЛЬСАВЕТАЎ АПАРТУНІСТЫЧНА АДНЕСЬЛІСЯ ДА ГЭТАГА ПЫТАНЬНЯ. ТАК, НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ЎГЛОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЗЛОБІН, (КАНДЫДАТ КП(б)Б), ЗАМЕСТ ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ ЗАЯВІЎ ВЯРБОЎШЧЫКУ: «У НАС НЯМА ЛЮДЗЕЙ, А КАЛІ ХОЧАШ, ДЫК ІДЗІ ВЯРБУЙ». СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ ІМЯ МОЛАТАВА В. ГАЖЫН ЗУСІМ АДМОВІЎСЯ АДПУСЬЦІЦЬ ЖАДАЮЧЫХ ЕХАЦЬ У ДАНБАС У ТОЙ ЧАС, КАЛІ Ў КАЛГАСЕ ЁСЬЦЬ ВОЛЬНЫЯ ЛЮДЗІ.

ПЕРШАЯ ПАРТЫЯ Ў 100 ЧАЛАВЕК, АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ДАНБАС ЗАЯВІЛА: «ЎДЗЕМ БІЦЦА ЗА ВУГАЛЬ ТАК, ЯК НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЕХ ЗА ЎРАДЖАЙ».

„Раённая камісія—справа лішняя"

ГЛУСК. ВЯРБОЎКА РАБОЧЫХ ДЛЯ ДАНБАСУ ПА ГЛУСКІМ РАЁНЕ ПРАХОДЗІЦЬ МАРУДНА. РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ АДДАЛІ НАЛЕЖНАЙ УВАГІ ГЭТАМУ ПЫТАНЬНЮ. ЯНЫ ПАЛІЧЫЛІ ЛІШНІМ СТВАРЫЦЬ РАЁННУЮ КАМІСІЮ САДЗЕЙНАСЬЦІ ВЯРБОЎЦЫ. РАЙКАЛГАССАЮЗ АБМЕЖАВАЎСЯ ТЫМ, ШТО РАЗЬМЕРКАВАЎ ЛЮДЗЕЙ І ПАСЛАЎ ДЫРЭКТЫВЫ КАЛГАСАМ. АЛЕ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ ГЭТЫХ ДЫРЭКТЫЎ РАЙКАЛГАССАЮЗ НЯ РОБІЦЬ.

НАВАТ РАЁННАЯ ГАЗЭТА НЕ АСЬВЯТЛЯЕ НА ОВАІХ СТАРОНКАХ ГЭТАГА ПЫТАНЬНЯ.

РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ЗАРАЗ-ЖА ПЕРАБУДАВАЦЬ СВАЮ РАБОТУ, КАБ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ДАЦЬ ДАНБАСУ 300 РАБОЧЫХ.

В. В.

Ад рэдакцыі: Згодна пастановы ЦКК УсеКП(б) і НК РСІ СССР пра адыходніцтва, кантрольныя лічбы на патрэбную рабочую сілу даводзяцца толькі па раёну вярбоўкі. Катэгарычна забараняецца даводзіць кантрольныя лічбы да паасобных сёл і калгасаў. Глускія арганізацыі павінны неадкладна выправіць сваю памылку.

Дровы—Менску

Тысячы кубамэтраў дроў чакаюць пагрузкі

Дастаўка тармозіцца з-за непадачы вагонаў

Чыгуначнікі, арганізуйце брыгады для кантролю за сваячасовай адпраўкай дроў

Матар'ялы з месц, якія зьмяшчаліся на старонках «Зьвязды» і якія зьмяшчаюцца сёньня, гавораць за тое, што большасьць леспрамгасаў і раённых арганізацый БССР ня выконваюць апошняй пастановы ЦКК-НК РСІ БССР аб дровалесазагатоўках.

Рашучае паказаньне ЦКК-НК РСІ БССР аб тым, каб Лесбел, леспрамгасы і раённыя арганізацыі фарсавалі распрацоўку і вывазку дроў і лесаматар'ялаў на працягу жніўня і верасьня такімі тэмпамі, якія-б забясьпечылі ліквідацыю да 1 кастрычніка 1931 году прарываў, допушчаных на працягу году, Глускім, Рэчыцкім, Бабруйскім, Бярэзінскім, Чэрвеньскім, Тураўскім і іншымі раёнамі і леспрамгасамі ня выконваецца.

Толькі гэтым тлумачыцца той факт, што жнівень і пачатак верасьня не зрабілі абсалютна ніякага перапому на фронце дровазагатовак і вывазкі.

Калі на 1 жніўня гадавы плян дровазагатовак быў выкананы на 27,6 проц., дык на 11 верасьня за 42 дні работы 34-х леспрамгасаў гадавое заданьне выканана на 32,3 проц., або павялічэньне ўсяго на 4,7 проц.

Буйнейшыя леспрамгасы БССР—Рэчыцкі, Асіпавіцкі, Бабруйскі, Глускі, Тураўскі, Пасталоўскі, Гомельскі і рад іншых—ня выходзяць з паласы прарываў.

Аб дрэннай рабоце гэтых і раду іншых леспрамгасаў і раёнаў «Зьвязда» пісала ня раз. Аднак, сыгналы ЦО КП(б)Б застаюцца для кіраўнікоў гэтых леспрамгасаў і тых раённых арганізацый, якія непасрэдна кіруюць работай апошніх, толькі пустымі стрэламі.

Гэтыя асноўныя леспрамгасы і па сёнешні дзень не прынялі рашучых захадаў да выкананьня пастановы ЦКК-НК РСІ БССР аб дровалесазагатоўках, якая вызначае канкрэтныя шляхі ліквідацыі прарыву.

Раённы друк, які павінен адыграць вялізарную ролю ў справе дровазагатовак і вывазкі, ня ўключыўся ў асьвятленьне гэтай работы на сваіх старонках.

Пераважная большасьць раённых газэт БССР, ня гледзячы на пагражаючае становішча, на фронце дровазагатовак і вывазкі, моўчкі абыходзяць гэтую важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію.

Справа з падвозкай загатоўленых дроў да чыгуначных станцый не палепшылася. Пляны вывазкі на 11 верасьня выкананы ўсяго на 43,7 проц. Яшчэ горш стаіць справа з адгрузкай дроў прамысловасьці і рабочым цэнтрам.

Непадачай вагонаў-паражняка чыгунка зрывае дастаўку нават тых запасаў дроў, якія зараз падвезены да чыгуначных станцый.

Толькі з-за адсутнасьці вагонаў зрываецца забясьпячэньне дровамі Менску. За 13 дзён верасьня паступіла замест 1.300 вагонаў усяго 709.

Такое становішча з забясьпячэньнем дровамі Менску ў далейшым ня можа быць цярпіма. Чыгунка і ў першую чаргу рабочыя-чыгуначнікі павінны прыняць усе меры да таго, каб даць патрэбную колькасьць вагонаў-паражняку для дастаўкі дроў Менску.

Прарыў на фронце дровазагатовак і вывазкі павінен быць ліквідаван.

Органы РСІ абавязаны прыняць усе захады да таго, каб на мясцох забясьпечыць поўнае выкананьне пастановы ЦКК-НК РСІ БССР аб дровалесазагатоўках, і ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца крутога пералому на гэтым адказнейшым вучастку работы

Рахунак чыгунцы

БАБРУЙСК. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). НЕПАДАЧА ВАГОНАЎ ПА ЗАЯЎКАХ ЛЕСПРАМГАСУ ЗРЫВАЕ АДГРУЗКУ ДРОЎ МЕНСКУ.
ЛІАКУМОВІЧ.

***

ЖЫТКАВІЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 13 ВЕРАСЬНЯ ЗАПАТРАБАВАНА ПАД АДГРУЗКАЙ ДРОЎ МЕНСКУ 37 ВАГОНАЎ. НЕ ПАДАНА НІВОДНАГА. ЗАПАСЫ ДРОЎ ВЯЛІКІЯ. НА ЧЫГУНАЧНАЙ СТАНЦЫІ ЛЯЖАЦЬ ЗАПАСЫ ДРОЎ НА 52 ВАГОНЫ І 75 ВАГОНАЎ НА АДЛЕГЛАСЬЦІ 2-х КЛМ. АД СТАНЦЫІ, ЯКІЯ ПРЫБЫЛІ СПЛАВАМ.
ГУТЭРМАН.

***

СТАРУШКІ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 11 ВЕРАСЬНЯ ПАДАНА 28 ВАГОНАЎ. 12—НІВОДНАГА.
РЭЙДЭР.

***

РЭЧЫЦА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 13 ВЕРАСЬНЯ ДРОЎ ДЛЯ МЕНСКУ НЕ АДГРУЖАЛІ З-ЗА АДСУТНАСЬЦІ ВАГОНАЎ.
ГАЎЗМАН.

Па тэлеграфу з леспрамгасаў
Лічбы трывогі

РЭЧЫЦА, 13.

На 11 верасьня Рэчыцкі леспрамгас загатовіў 112 тыс. кбм. дроў, што складае 16,7 проц. гадавога пляну.

Вывезена 210.200 кбм., або 31 проц. гадавога заданьня.

Рэчыцкія раённыя арганізацыі ня прымаюць ніякіх захадаў да ліквідацыі прарыву на фронце дровазагатовак. Пастанова ЦКК-НК РСІ БССР аб дровазагатоўках Рэчыцкім раёнам ня выконваецца.

***

КАПЦЭВІЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 10 ВЕРАСЬНЯ З КАПЦЭВІЧ АДПРАЎЛЕНА Ў МЕНСК 15 ВАГОНАЎ ДРОЎ. 11-ГА ВЕРАСЬНЯ ПАСТАЛЫ АДГРУЗІЛІ 20 ВАГОНАЎ.

НАРМАЛЬНУЮ АДГРУЗКУ ДРОЎ МЕНСКУ З КАПЦЭВІЧ, ПТЫЧУ І ПАСТАЛАЎ СЫСТЭМАТЫЧНА ЗРЫВАЕ ГАЛОЎНЫ ДЫСПЭТЧАР ГОМЕЛЬСКАГА ВУЗЛА, ЯКІ АДМАЎЛЯЕЦЦА ПАДАВАЦЬ ВАГОНЫ. ПЛЯНЫ ЛЕСАЗБЫТУ РЭАЛЬНЫЯ. ПРЫ ПАДАЧЫ ВАГОНАЎ—ПАРАЖНЯКА БЕСЬПЕРАБОЙНАЯ ВЫВАЗКА ДРОЎ У МЕНСК БУДЗЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНА.

АСІПАВІЧЫ, 15.

Асіпавіцкі раён за першую дэкаду верасьня ўзьняў тэмпы дровалесазагатовак усяго на 4,8 проц.

Загатоўлена 12.695 кбм., што складае 30,8 проц. гадавога пляну. Вывезена 137,343 кбм., або 32,9 проц. заданьня.

***

БАБРУЙСК, 15.

Гадавая праграма дровазагатовак па Бабруйскім леспрамгасе складае 403.000 кбм. На 11 верасьня загатоўлена толькі 87.151 кбм., што складае 21,6 проц. заданьня. Вывезена 118,595 кбм., або 28,1 проц. гадавога заданьня.

***

ЕЛЬСК, 15.

Ельскі леспрамгас у выніку дрэннай арганізацыі працы, работы па-старынцы, —на працягу ўсяго сэзону ганебна адстае па выкананьні плянаў дровазагатовак

На 11 верасьня загатоўлена 79.973 кбм. дроў, што складае 37, проц. гадавога заданьня.

Вывезена 80.998 кбм., або 68,1 проц. агульнага гадавога пляну.

П. Арцельны

ЗА ПЕРШУЮ ПРЭМІЮ

Кілёмэтраў за два на поўдзень ад цэнтру калгасу відаць цэлая куша зеляніны. Гэта сады. У гушчары садоў прытаіліся розныя будынкі. Раней тут панавалі кулакі Барановускія. І толькі магутны размах калектывізацыі сьпісаў Барановускіх.

Цяпер тут сьвінагадоўчая таварная калгасная фэрма калгасу «СЛУЧ», Слуцкага раёну. Раскошныя хлявы вельмі падышлі для сьвінарнікаў. Прыгожыя дамы далі прытулак осьпічкам і батракам, што працуюць на фэрме.

Клапатлівая рука калгасьніка кулацкія стайні перарабіла ў калгасныя сьвінарнікі. Прарэзалі шырокія вокны, паклалі падлогу. З частаколу парабілі загародкі-станкі, выслалі калідор дошкамі. Пасьля пабелкі 2 сьвінарнікі сталі выглядаць на манэр «амэрыканскіх».

Неўзабаве прыбылі кватаранткі. Белыя, чорныя, сівыя, рабыя, рознакалёрныя сьвінаматкі.

Спадабалася новасельле сьвіням. Павялічэньнем сьвінога племя ды прыростам сала, бэкону дзякавала сьвіня людзям за клопаты. За адзін год больш, чым у тры разы павялічылася стада; 80 сьвінаматак, 50 падсьвінкаў, ды сотню парасят напічэце зараз фэрма.

40 адкормленых падсьвінкаў ад 1 да паўтара цэнтнараў вагою здала фэрма дзяржаве.

Фэрма расьце, цесна робіцца стаду. Калгас закончвае пабудову новага сьвінарніка на 100 сьвінаматак. Але пабудаваўшы на 100, трэба пачынаць на 200, бо стада расьце.

Абязьлічка і непаладкі ззаду

Не адразу фэрма стала такой. Ззаду вядзекі, ігнараваньні, непаладкі.

Быў час, калі склад брыгады сьвінароў мяняўся часта. Кожны дзень надкувалі сьвінары заявамі — зьняць іх са сьвінарніка. Лічылі, што працаваць на сьвінарніку жэнка для «саматойнага» чалавека.

«Сьвіней даглядаць — гэта бабская справа, — казалі многія калгасьнікі, — ім там толькі і калупацца».

Выдучылі брыгаду, а глядзіш праз тыдзень — ужо брыгада новая, бо «старыя» сьвінары адмалі работу ў сьвінарніку. Частая вымена сьвінароў балюча біла па фэрме, пагражаючы ёй поўным заняпадам.

Узьмялася крыкова. Фэрма — вядучая галіна гаспадаркі. Фэрма павінна даваць сала і мяса крайне і галоўны прыбытак, выгоду.

І вінаваты сьвіны хапаюць калгасьніка-ўдарніка ТАРАСА і назначаў яго загадчыкам фэрмы.

— Няўжо, думаю, тут нельга працаваць, — кажа Тарас, — і я, закасаўшы рукавы шчыра ўзяўся за работу на фэрме.

Падабралася з добраахвотнікаў ударная брыгада сьвінароў. Усе яны вольныя ад сваёй аднаасобнай гаспадаркі, — кожны работнік з брыгады сьвінароў цэлы дзень на фэрме, што вельмі спрыяе якасьці і прадукцыйнасьці працы.

Уся работа на фэрме з прыходам новай брыгады стала зьдзельнай. Зьнікла абязьлічка, бо кожны работнік мае пэўную працу, пэўную групу сьвіней.

Сучок Стэфка і Самусевіч Таня даглядаюць парасят і падсьвінкаў, Беразоўская Марыля і Марыля Кулеш даглядаюць сьвінаматак.

— Працу мы сваю любім і вунь як стараемся. Мусіць, ніхто лепш ня зможа даглядаць, — расказвае Стэфка пра сваю працу.

Перабіваючы Стэфку, дадае Таня:

— Гэта-ж у нас такая чарада сьвіней, а ўсе гладкія, як ліны.

Жанчыны жвава падхапілі вялікі цэбар замешкі і панесьлі карміць парасят. Цэлая плойма белых малышоў ліслівым натоўпам акружала цэбар. Парасяты наперабой з карыта хапалі па поўніцы смачную замешку на малацэ.

Сапраўды, на фэрме «Случ» паказаны новыя тэмпы працы. Цалкам аддаўшыся працы каля сьвіней, правільна расставіўшы свае сілы, ліквідаваўшы абязьлічку, увёўшы сапраўдную зьдзельшчыну, брыгада сьвінароў дала новую, больш высокую норму выпрацоўкі. Тут адна сьвінарка даглядае ў жнівэйшы сазон (калі сьвінаматкі не пароспцца) 40 сьвінаматак, у дзьвёх даглядаюць 80 штук. Таксама значна больш даглядаецца парасят і падсьвінкаў, чым гэта ўстаноўлена нормамі Белкалгасцэнтру.

Сонца і „фізкультура"

Браг у рэйку паведамляў, што ўсё ужо гатова і пара пускаць сьвіней дамоў. Дый сьвіньні самі ўжо ведаюць, што гэты браг палне поўным карытам цеста. Не чакаючы каманды пастуха, усё стада сьвіней, «духаватай кавалерыяй» нясецца да хаты. У гэты момант іх ніхто ня стрымае, усё на бок! Сьвіньня ведае парадак. Але сьвіная натура пераматае. Бягучы ў двор, так і меціць забегчы ў сад, каб схапіць непадабраныя яблыкі або грушы. І правільна! Зачыняй вароты, шпіцуй, ня будзе шкоды.

Цэлы дзень сьвіньні ў полі. На сонцы, на сьвежым паветры загартоўваецца сьвіное здароўе. Капаючыся, шчыплючы траўку на палны сьвіньні жыва перабягаюць з месца на месца. І гэта «фізкультура» умацоўвае сьвіньня косьці і мускулатуру.

Толькі два разы на дзень зазывае сьвіней на абед і на вячэру гучная рэйка. Прыбегшы ў сьвінарнік, сьвіньня атрымае порцыю замешкі сьвежай каномышнай атавы з бульбай, падпраўленай сыроваткай, якая бярэцца з суседняга малочнага заводу. Гэтыя летнія рацыёны таннны для гаспадаркі і каштоўны для сьвіней.

8 парасят за адзін апарос

У хаце загадчыка фэрмай Тараса ляжыць на стале з дзесятак кніжак і часопісяй. Тут вы знойдзеце і прафэсара Вагданава «Выращивание и откорм свиней», часопісь «Свиноводство», «Шляхі калектывізацыі».

Часта Тарас пытаецца ў сваіх паперовых таварышоў, што разьлегліся на стале, як лепш карміць і даглядаць сьвіней. Позна ўвечары, пры невялічкай лямпе Тарас шукае ў кніжцы адказу на пытаньне, якое спаткалася днём.

Тут-жа ляжыць агульны спытак, дзе заведзены пашпарты на кожную сьвінаматку. Вось пашпарт № 18 «Сьвінаматка «Красотка» — сівыя ліны на зваддку, куплена ў райкалгасаюзе. Злучана з кныром «Мішкам» 10 лютага 1931 году. Апарасілася 17 чэрвеня 1931 году; прыняла 9 штук парасят».

Адна сьвінаматка ў сярэднім дае за адзін апарос 8 штук парасят. Есьць і такія рэкордсменкі, што нараджаюць па 12 парасят два разы ў год і такія, што даюць па... адным-двое парасят. Першую шануюць, лепш даглядаюць, любяць. Другую накіроўваюць на сала. Адбор лепшых сьвінаматак — гэта ўзьняцьце прадукцыйнасьці «варштату», што творыць парасят.

За гэты напоўны год сьвінаматкі фэрмы «Случ» прынялі 170 парасят. За гэты-ж час па розных прычынах зьнікла 17 штук, што складае 10 проц.

Вылучан і забраніраваны фонд кормы для фэрм. 50 цэнтн. аўса, 44 — ячменю, 1.700 — бульбы, — 220 — кораньпподаў, 710 — азімай сапомы, 100 тон сілясу і 100 цэнтн. мякіны — вось кармовая база сьвінагадоўчай фэрмы «Случ», на аснове якой яна будзе разгортваць сваю сьвінагадоўлю. Гэта лічба поўнасьцю забясьпечвае фэрму неабходным кормам на нормах Сьвінаводкалгасцэнтру.

Вапна і крэалін—лепшая прафілактыка

Заразьлівыя хваробы — біч сьвінагадоўлі. Цяжка змагацца з хваробай, калі яна навалілася на сьвіньню. Найлепшы мэтад барацьбы — гэта прафілактыка. Фэрма «Случ» стаіць на гэтым верным шляху папярэджаньня.

Кожны дзень гной чыста выграбецца з загародак і вывозіцца далёка на поле, кожны дзень мыюцца кармушкі. Некалькі разоў на год сьцены і загародкі сьвінарніка старанна белядца адной вапнай, падлога і кармушкі абліваюцца крэалінам; вапна і крэалін зьнішчаюць усякіх мікробаў — носьбітаў хвароб.

— Аднаго разу, — расказвае Тарас, — захварэлі ў нас тры сьвінаматкі: узьнялася тэмпэратура да 41 градусу і нават вышэй. Прыехаў ветэрынар, паглядзеў хворых, пакруціў галавою і аддаў шаблённы загад: «зьнішчыць» і пахаў.

Шкода стала Тарасу сьвіней. Гэта былі самыя лепшыя маткі, пудоў па 8-10. Гэта-ж багацьцо калгасу. Узяўся

ФАШЫСЦКАЯ ЗГРАЯ АБВАСТРАЕ БЕЛЫ ТЭРОР

Год выданьня—XV
№ 252 (4157)
Серада 16 верасьня 1931
Цана нумару 5 коп.
БЕСЫ ГРАШНА

Зьвязда

Орган ЦК Мсп. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—6-27,3—сакратар—10-74, партсакратар—13-80, прапаганд.—13-60, сак. аддз.—6-19, масы.-інфарм.—6-19, эканом. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторай—6-41, аддзелаў абвестак—7-31

Закрыцьцё пралетарскіх часопісяй у Варшаве

Гнусная кампанія прадажных пісак супроць арыштаваных пісьменьнікаў

ПРАТЭСТ МІЛЬЁНАЎ

Увядзеньне ваенна-палявых судоў, масавыя арышты на абшарах усёй Польшчы рэвалюцыйных рабочых і сялян, асабліва на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне абвастрэньне «паціфікацыі» на тэрыторыі гэтых апошніх краін, паход на палітзьняволеных у беларускіх турмах — выклікалі новую буру пратэстаў з боку працоўных Савецкай Беларусі. Кожны дзень нават з самых глухіх куткоў БССР прыходзяць рэзалюцыі пратэсту супроць разгулу белага тэрору ў беларускай Польшчы.

Ва ўсіх рэзалюцыях пратэсту рабочыя, калгасьнікі, саўгасьнікі, беднякі і сераднякі-аднаасобнікі заяўляюць, што яны напружваюць максымум энэргіі, каб выканаць і перавыканаць пяцігодку і тым самым наблізіць расплату з крывавымі катамі. Калгасьнікі, беднята і сераднякі-аднаасобнікі на разгул белага тэрору ў беларускай Польшчы адказваюць чырвонымі абозамі збожжа, уступленьнем у рады МОПР'у, а таксама адлічэньнямі ад сваёй зарплаты і зборам сродкаў па падпісных лістох у дапамогу палонным капіталі і іх сем'ям.

Так, агульны сход калгасьнікаў і сялян-аднаасобнікаў вёскі Нізон, Прысыцкага сельсавету, Вузьдзеньскага раёну з абурэньнем пратэстуе супроць карных экспедыцый у Зах. Беларусі і Зах. Украіне, супроць увядзеньня ваенна-палявых судоў.

Калгасьнікі і аднаасобнікі ў адказ на разьюшаны бепы тэрор усе ўступаюць у рады МОПР'у, праводзяць суботнік па вывазцы лесу і сродкі ад яго ўносяць у фонд дапамогі палітзьняволеных у Польшчы, якія зараз змагаюцца не на жыцьцё, а на сьмерць супроць увядзеньня паліцэйска-дэфэнзыўнага рэгляманту.

Калгасьнікі і аднаасобнікі выклікаюць і іншыя калгасы гэтага-ж сельсавету і раёну пасьледаваць іх прыкладу.

— Калгасьнікі калгасу «Будаўнік», Камяноўскага сельсавету, уносяць аднадзенны заработак у карысьць МОПР'у і ўсе, як адзін уступаюць у рады яго.

— Калгасьнікі калгасу імя Леніна, Вузьдзенскага раёну, горача пратэстуючы супроць крывавага паходу фашысцкай дыктатуры з мэтай задушэньня рэвалюцыйнага руху, уносяць 86 руб. у дапамогу палітзьняволеным і іх сем'ям.

— Калектыў супрацоўнікаў НКФ далучаецца да магутнай хвалі пратэстаў усіх працоўных БССР супроць зьверскіх і барбарскіх катаваньняў палітзьняволеных у засьценках беларускай Польшчы, супроць увядзеньня ваенна-палявых судоў.

Фашысцкі ўрад Польшчы, рыхтуючыся да інтэрвэнцыі супроць СССР, імкнецца пры дамазе сваіх верных кляканў — сацыял-фашыстаў затаніць у крыві рэвалюцыйны рух пралетарыяту Польшчы і рэвалюцыйна-вызваленчую барацьбу працоўных мас Зах. Беларусі, і Зах. Украіны, каб падрыхтаваць тыл будучай вайне.

Таварышы рабочыя і сяляне Польшчы! Памятайце, што ў сваёй барацьбе вы не адны, што з вамі пралетарыят усяго сьвету і ў першую чаргу ўдарная брыгада сусьветнага пралетарыяту — працоўныя Савецкага Саюзу.

У адказ на шалёны тэрор польскага фашызму мы супрацоўнікі НКФ і Галоўнага кіраўніцтва ашчадкасамі БССР, пастанаўляем:

Яшчэ мацней узьняць нашу работу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва за стопроцантнае выкананьне фінпляну, уоім уступіць у члены МОПР'у і Асоавіяхіму; у дапамогу палітзьняволеным Польшчы ўносім 1 проц. месячнай зарплаты.

Далоў белы тэрор!
Далоў польскіх акупантаў! !
Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы!
Няхай жывуць КП(б)Б і КПЗБ!

**

Агульны сход рабочай моладзі торфазаводу імя Даўмана (ст. Вобаль) за абурэньнем пратэстуе супроць крывавай «паціфікацыі» ва ўсёй Польшчы.

Сход пастанаўіў у адказ на тэрор фашысцкай дыктатуры **адпрацаваць 5 гадзін па ўборцы торфу на карысьць семьяў палітзьняволеных.**

— **Група студэнтаў-практыкантаў Беларускага хэміка-тэхналёгічнага інстытуту і тэхнікуму,** якія працуюць на гуце «Кастрычнік», — у адказ на белы тэрор фашысцкіх катаў абвясьцілі сябе ўдарнай на праходжаньні вытворчага навучаньня і адпачасова ўносіць 20 руб. у фонд дапамогі палітзьняволеным і іх семьям. **Студэнты выклікаюць групу практыкантаў заводу імя Домбаля пасьледаваць іх прыкладу.**

— **Канфэрэнцыя асьветнікаў Прапойскага раёну** на тэрор польскай паліцэйшчыны **адказвае ўнясеньнем 1 проц. месячнай зарплаты.**

Канфэрэнцыя выклікае на сацпаборніцтва іншыя саюзныя арганізацыі Прапойшчыны

Акрамя гэтага рэзалюцыі пратэсту супроць абвастрэньня фашысцкага тэрору ў Польшчы, супроць увядзеньня ваенна-палявых судоў атрыманы ад гр-н **Вялекаўскага сельсавету, ад калгасьнікаў калгасу імя Леніна і аднаасобнікаў вёскі Валерыянава, Хатлянскага сельсавету, ад гр-н пасёлку Канстантынава, ад гр-н вёскі Ялаўкі, ад міжсоюзнага сходу працоўных м. Прапойска сумесна з арганізаванымі саматужнікамі, ад рабочых і служачых саўгасу «Над-Нёман», ад агульнага сходу калгасу «Камунар» і аб'яднанага агульнага сходу калгасьнікаў калгасу імя Молатава і «Ударнік».**

Закрыт орган польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў „месячнік літаратуры"

ВАРШАВА, 14. «Газэта Варшавска» паведамляе, што ў сувязі з АРЫШТАМ ГРУПЫ ПОЛЬСКІХ ПРАЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ улада ліквідавала АДЗІНЫ ў Польшчы орган польскай пралетарскай літаратуры — «МЕСЯЧНІК ЛІТАРАЦКІ».

Мора хлусьні і гразі

для апраўданьня барбарства

ВАРШАВА, 14. У сувязі з арыштам групы левых пісьменьнікаў у Варшаве, уся фашысцкая і сацыял-фашысцкая прэса ўзьняла шалёную кампанію супроць арыштаваных, закідваючы іх гразьвю. Урадавая прэса арышт левых пісьменьнікаў прадстаўляе, як «выключны посьпех паліцыі, якой пасьля двухгадовай сьлежкі ўдалося дабрацца да самога цэнтру камунізму». Так піша ўрадавая прэса, хаця арыштаваныя шырока вядомыя толькі Варшаве, ва ўсёй Польшчы, але нават і заграніцаю. Адзін з арыштаваных зьяўляецца рэдактарам папулярнага «Месячніка літаратацкага», другі — сакратаром рэдакцыі часопісі «Ведамосьці літаратацкія».

Фашысцкая і сацыял-фашысцкая прэса з прысмакам заяўляе аб «вялізарным кампраматуючым матар'яле», які нібы быў знойдзен у часе вобыску. Гэтыя «надзвычай кампраматуючыя матар'ялы» складаюцца з аднаго экзэмпляра «Іпрэкор», некалькіх савецкіх апавяданьняў, а таксама копій «адкрытых лістоў», разасланых да ўсіх польскіх літаратурных аб'яднаньняў з прычыны ўвядзеньня новага турэмнага рэгляманту.

Фашысцкія і сацыял-фашысцкія пісакі распісваюцца аб «вялікім жыцьці» арыштаваных пісьменьнікаў, хаця яны жылі так бедна, што гэта беднасьць сярод літаратурных колаў Варшавы зрабілася прыказкай. Паводле фашысцкай прэсы група левых пісьменьнікаў мела месячны бюджэт ня менш, як у 100.000 злотых, а разам з выдаткамі на «падтрыманьне забастоўкі трамвайшчыкаў», амаль 270.000 злотых.

Гэта яўная бязглузьдзіца пішацца сьвядома, у мэтах, каб гуманісты і радыкалы з членаў варшаўскага «Пэнклюбу» (літаратурнае буржуазнае аб'яднаньне) магілі з «чыстым сумленьнем прайсьці міма арыштаваных або ў лепшым выпадку выступіць з фармальным пратэстам.

Што-б ня пісалі фашысцкія і сацыял-фашысцкія прадажныя шкуры, якой-бы гразьвю яны не закідвалі арыштаваных пісьменьнікаў, ім усё-ж ня ўдасца ўтаіць праўды перад шырокімі працоўнымі масамі, што гэтыя людзі схоплены і пасаджаны за краты толькі за тое, што адважыліся ўзьняць голас пратэсту супроць разгулу крывавага тэрору ў засьценках беларускай Польшчы.

Вырвем з крывавых лап фашызму левых пісьменьнікаў Польшчы

БАБРУЙСК, 15. (Па тэлефоку). Заснуваўшы паведамленьне аб арышце групы левых польскіх літаратараў у Варшаве, агульны сход Бабруйскай філіі БелАПП'у супольна з літгуртком'ам выказвае свой рашучы пратэст супроць барбарскай дзейнасьці разьюшанай Піпсудчыны, якая разграміла ўсе легальныя арганізацыі польскага пралетарыяту і працоўнага сялянства, душыць кожнае праяўленьне грамадзкай думкі, кожны голас пратэсту супроць фашысцкага разгулу.

Сход заклікае ўсе пралетарскія пісьменьніцкія арганізацыі ўзьняць свой голас пратэсту, вырваць з крывавых лап разьюшанага фашызму левых польскіх літаратараў.

6 мільёнаў страт у выніку пажараў

«Дзеньнік Віленскі» ад 13 верасьня зьмяшчае цікавую статыстыку аб выніках пажараў на працягу першага паўгодзьдзя 1931 году **у адной толькі Віленшчыне.**

Згарэла 295 гаспадарчых будынкаў, 428 дамоў, 30 складаў, 9 лясных сторажніц і г. д. Пажары прынесьлі страт на **6 мільёнаў злотых.**

Значная частка пажараў—**вынік падпалаў.**

16-га верасьня, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні Дому Кам. Асьветы імя Карла Маркса адбудзецца канфэрэнцыя ўдарнікоў Менскіх фабрык, заводаў, інжынэрна-тэхнічных кадраў, рабкораў, працаўнікоў друку, калгасьнікоў Менскага раёну, радыё-вынаходцаў, працаўнікоў БКС, Белрадыёцэнтру, ТПР.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. **Уступная прамова Культпропу ЦК КП(б)Б.**
2. **Радыё на службу сацыялістычнага будаўніцтва (даклад інжынэра Агракомава).**
3. **Спрэчкі па пытаньнях радыёфікацыі і радыёвяшчаньня Беларусі.**
4. **Вялікі канцэрт сіламі Белрадыёцэнтру.**

Білеты разьмеркаваны па прадпрыемствах.

Цэнтральны штаб.

„Мы змагаемся за сацыялістычную рэспубліку"

Правал сацыял-фашыстаў у Бэрліне

БЭРЛІН, 15. Нямецкая кампартыя арганізавала нядаўна ў Бэрліне дыскусійны сход. Старшыня Бэрлінскай арганізацыі сацыял-дэмакратычнай партыі Кюнстлер, запрошаны на гэты сход, адмовіўся зьявіцца.

Імкнучыся згладзіць ураганьне, якое стварылася ад гэтага ўхіленьня, кіраўніцтва арганізацыі сацыял-дэмакратычнай партыі было прымушана арганізаваць вялікі мітынг у «Спорт-палацы» і запрасіць на гэты мітынг судакладчыка ад кампартыі. На вуліцах, якія прылягалі да «Спорт-палацу», сабралася 30-40 тыс. рабочых, якія хацелі папасьці на мітынг. Баючыся, што «Спорт-палац» будзе запоўнены рэвалюцыйнымі рабочымі **кіраўніцтва сацыял-дэмакратычнай арганізацыі заключыла ўмову з паліцэй-прэзыдыумам.** Паліцэйскія, заняўшыя ўваходы ў «Спорт-палац», прапускалі туды толькі тых, хто мог прад'явіць сацыял-дэмакратычны партбілет. Факт паліцэйскай праверкі палітычнай прыналежнасьці прыйшоўшых на мітынг рабочых выклікаў вялікае абурэньне сярод сацыял-дэмакратычных рабочых. Дзесяткі тысяч рэвалюцыйных рабочых, недапушчаных паліцыяй на мітынг, спакойна чакалі далейшага.

Раптам без усякага повада, паліцэйскія пачалі разганяць рабочых, бязьлітасна ўжываючы гумавыя дубінкі. Частцы рэвалюцыйных рабочых удалося прарвацца ляцьцё паліцэйшчыны з «Спорт-палац» і прайсьці ў залю. Заля была напалову пустая. Вельмі многія сацыял-дэмакратычныя рабочыя палічылі лепш дэманстраваць з камуністычнымі рабочымі супроць паліцэйскага тэрору. Паліцыя спрабавала разагнаць гэтых дэманстрантаў, ня спыняючыся нават агнястрэльнай зброяй.

З дакладам на мітынгу выступіў старшыня бэрлінскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі Кюнстлер. Уся яго прамова зьявілася да агідзнага цкаваньня кампартыі, прычым адзіны аргумант гэтага цкаваньня зводзіўся да нападак на кампартыю за тое, што яна стала на чале ўсенароднага галасаваньня Прусіі.

Тав. Гейнц Нэйман, які выступіў ад імя кампартыі, раскрытыкаваўшы прамову Кюнстлера, заявіў:

«Мы камуністы таксама зьяўляемся рэспубліканцамі. Тая рэспубліка, якой мы хочам, гэта не рэспубліка, на чале якой стаіць Гіндэнбург і Брюнінг, гэта не рэспубліка, паліцыя якой гумавымі дубінкамі разганяе беспрацоўных, гэта не рэспубліка надзвычайных дэкрэтаў, гэта не рэспубліка, у якой фашысцкія забойцы гуляюць на волі. **Рэспубліка, за якую мы змагаемся,— гэта сусьветная сацыялістычная рэспубліка.** (Бурныя воплескі). Дыктатура, за якую мы змагаемся, гэта не дыктатура ўраду Брюнінга, гэта не дыктатура на карысьць капіталістаў за кошт беспрацоўных і рабочых, дыктатура, якой мы хочам,—**гэта тая дыктатура, аб якой гаварылі Маркс і Энгельс, гэта дыктатура пралетарыяту».**

„КУЛЬТУРА"
Пач. у 7; 8-45; 10-30
Буйны мастацкі зменны фільм
Шчасьце матуні Краузэ
Інтэрнацыянал
Адкр. з 12 г. дня.
Усходні мастацкі фільм
ХАЗ МУШ
„Юны Піянэр"
(будынак кіно „Культура")
ІГАР ІЛЬІНСКІ ў камэдыі
НАЛІ ПРАБУЖДАЮЦЦА МЁРТВЫЯ
Пач. у 1 г. і 2 г. 30 м. Каса—з 11 г. дня
КІНО „СПАРТАК"
З 16 ВЕРАСЬНЯ
бытавы фільм
КАФЭ ФАЛКОНІ
драма ў 6 частках.
Штодзённа 4 сэансы:
Пачатак у 6-30, 8, 9-30 і 11 г. веч.
Каса адкрыта з 5 г. веч.

КЛЮБ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ
Першы Расійскі Драматычны Тэатр УЗП БССР пад кіраўніцт. В. В. Кумельскага
16 верасьня
ПРЭМ'ЕРА
„НА ДНЕ" М. Горкага
Білеты ў касе клюбу з 6 гадз.

Дом Пісьменьнікаў (Савецкая, 66).
16 верасьня, у 8 гадзін вечара
— адбудзецца —
па-зачарговы сход пісьменьнікаў і літаратараў
гор. Менску.
Федэрацыя Аб'яднаньняў Савецкіх Пісьменьнікаў Беларусі.

Занятыя студэнтаў, прынятых у 1931-32 годзе
на парт. адзяленьне Кемвузу,
пачынаючы з 1 Кастрычніка, да якога часу ўсе студэнты, запісаныя на гэтыя адзяленьні павінны зьявіцца на заняткі.
Аб пачатку заняткаў на іншых адзяленьнях будзе паведамлена асобна.
РЭКТАРАТ КУБ.

Гукавы Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Ад серады, 16 верасьня
Новы гукавы мастацкі фільм
АДНА
ДРАМА 7 ЧАСТКАЎ
Рэжысэры: Г. Козінцаў, Л. Трэўбэрг
Апэратар А. Москвін
Гукаапэратар І. Волк
Мастак Е. Еней
Кампазытар Д. Шастаковіч
у гал. ролі Галина Кузьміна
Пачатак у 7, 8-45 10-30. Каса—з 5 гадз.

Савецкая № 67 тэл. 9—16
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
Мастацкі фільм
Адкрыта з 12 г. дня
РЭЙС МІСТЭРА ЛЕЙДА
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
БРОНЕЦЯГНІК
Пачатак 1-га сэансу ў 2 г., 2-га—3—30. Вечэрні: 7, 8-45 і 10-30

Менск на Віцебск
меняю вялікі пакой каля гарадзкога саду, з карыстаньнем кухняй. Пажадана 2 пакоі. Даведацца: Дрэзнапрацоўчая 29, Столяроў, з 5 да 7 гадз. веч.

Украдзен 13-IX-31 г. бумажнік з дакумантамі на імя Мермна Г. Б. і на імя калгасу „Зьвязда", Лічацкага с.-с. Мен. раёну. Просьба зьвярнуць за ўзнагароду па адрасе: вёска Лічкі, Лічацк. с.-с., Мен. р-ну, калгасу „Зьвязда".

На падставе пастановы праўленьня Дзяржбанку,
Усебеларускага і Менскае аддзяленьне
ДЗЯРЖБАНКУ
паведамляюць аб тым, што
КАЛЕТЫ ЗАЙМ ПА IV КВАДРУ
1931 г.
павінен быць прадстаўлен не
позьней 26-га верасьня г. г.
з разьбіўкай па месяцах.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

МЕНСКІ РАБФАК пры БДУ.
Іспыты на дзенны рабфак адбудуцца 22, 23, 24 верасьня.
на вячэрні—27, 28, 29 верасьня.
Працягнут прыём заяў на яўрэйскае і польскае аддзяленьні
ДА 20 ВЕРАСЬНЯ.
Загадчык рабфаку БДУ Сташэўскі.

Мясаны сьмрадзіннаму аб'яднаньню БЕЛКАПСАЮЗУ.
ПАТРЭБНЫ для работы ў Менску і раёнах БССР
адказн. выканаўцы па сьпінаадкорме, зоатэхніці, тэхніці-сьпінаводы, работнікі знаёмыя са сьпінаадкорменчымі апрацыямі, экспаніст, справавод-машыністка і вопытны статыстык.
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
Зьяўляцца: Савецкая 43-13, тэл. 14-95.

ЗГУБЛЕН
пашпарт, выд. мен. міліцыяй на імя Эвенчыка І. Л.
Лічыць несапраўдным.

Згублен пашпарт на імя Ушхоўскага М. Л., выд. Менскім міліцыяй. Лічыць несапраўдным.

НЕ РАЗБРАЕНЬНЕ, А ПАДРЫХТОЎКА СУСЬВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Дагавор аб адмаўленьні ад зброі гарантуецца... гарматамі

ЖЭНЭВА. 11 верасьня на пленуме Лігі Нацый у Жэнэве з прамовай выступіў францускі міністар замежных спраў Брыян, які спыніўся на пытаньні аб маючай адбыцца ў лютым 1932 году між народнай канфэрэнцыі па «разбраеньні». Брыян перш за ўсё абвергнуў паведамленьне, якое за апошні час стала больш частым, аб тым, што францускі ўрад дабіваецца адтэрміноўваньня канфэрэнцыі. Заяўіўшы, што францускі ўрад, наадварот, настойвае на скліканьні канфэрэнцыі ў назначаны тэрмін, Брыян далей намякнуў, што на будучай канфэрэнцыі француская дэлегацыя **намерана заняцца ня столькі пытаньнем «разбраеньня», колькі пытаньнем аб забясьпячэньні так званай «бясьпечнасьці».**

Як-бы працягам і далейшым разьвіцьцём заяў Брыяна зьявілася прамова прадстаўніка Пішчаній **Мадар'яга.** Падтрымліваючы брыянаўскую прапанову наконт забясьпячэньня «бясьпечнасьці», Мадар'яг заявіў, што ўсякая дзяржава, якая парушае статут Лігі Нацый, павінна лічыцца «бандытам» і павінна быць прызнана ваючай супроць членаў Лігі. Па думцы Мадар'яга, ні адна дзяржава не павінна быць нэйтральнай, не павінна застацца ў баку ад канфлікту паміж гэтым так званым «бандытам» і членамі Лігі. Паводле яго слоў, **ніякае разбраеньне немагчыма да таго часу, пакуль магчымы такі нэйтралітэт.**

Выступленьні Брыяна і Мадар'яга кідаюць яркае сьвятло на характар падыходзячай канфэрэнцыі па «разбраеньні». Яшчэ больш выразна абрысоўваецца характар гэтай канфэрэнцыі ў сувязі з паведамленьнямі францускай прэсы аб перагаворах, якія вядуцца зараз паміж Францыяй і Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі. Паводле газэтных паведамленьняў, перагаворы гэтыя вядуцца ўжо некалькі месяцаў і датычаць папярэдняй падрыхтоўкі да канфэрэнцыі па разбраеньні. Зьмест перагавораў зводзіцца да пытаньня аб тым, як **«забясьпечыць зубамі дагавор Кэлёга».**

Дагавор Кэлёга, падпісаны ў 1928 годзе 52 дзяржавамі, накладае на гэтыя дзяржавы абавязацельства адмовіцца ад прыстасаваньні зброі для дасягненьня мэтаў іх замежнай палітыкі. У дагаворы, аднак, няма ніякіх указаньняў наконт таго, што і хто павінен рабіць у выпадку, калі гэты дагавор будзе парушан якой-небудзь дзяржавай. Цяперашнія француска-амэрыканскія перагаворы наконт «забясьпячэньня дагавору Кэлёга зубамі», відавочна, і палягаюць даць адказ на гэта пытаньне.

Француская буржуазная газэта «Матэн» сьцьвярджае, што Злучаныя Штаты гатовы падтрымаць францускую прапанову наконт таго, каб усе ўрады абавязаліся прынамсі не аказваць падтрыманьня тэй дзяржаве, якая будзе прызнана нападаючай старанай. Разам з тым **любой дзяржаве павінна быць прадстаўлена права выступіць супроць гэтай нападаючай са зброяй у руках.**

**

І так, надыходзячая канфэрэнцыя па «разбраеньні» павінна ператварыцца ў канфэрэнцыю **па забясьпячэньні ўдзелу ў будучай вайне абавязкова ўсяго сьвету.** Але хто-ж гэты «бандыт», супроць якога ў будучай вайне павінны выступіць увесь сьвет? На гэта пытаньне ня цяжка адказаць, што жаніўскія «міратворцы» ўжо раз без усякіх падстаў прабавалі абвясьціць СССР парушыцелем дагавору Кэлёга, а ўся дзейнасьць Лігі Нацый разьвіваецца так, каб забясьпечыць магчымасьць абвяшчэньня СССР нападаючай старанай у любым будучым канфлікце паміж СССР і капіталістычнымі дзяржавамі.

Жаночую рабочую сілу— у прамысловасьць

ПАДХАПІЦЬ ПАЧЫН ФАБРЫКІ „КАМУНАРКА"

Шпаркі рост сацыялістычнага будаўніцтва, перавод работы прадпрыемстваў на 7-мігадзінны рабочы дзень, шматзьменнасьць і бесьперапынны вытворчы тыдзень патрабуе новыя шматтысячныя кадры рабочых для фабрык, заводаў і пабудоў Беларусі.

Ва ўмовах ліквідацыі беспрацоўя ў краіне і вычарпаньня ў асноўным усіх рэзэрваў мужчынскай рабочай сілы ў гарадох, асноўным шляхам вырашэньня праблемы кадраў для прамысловасьці зьяўляецца арганізацыя адыходніцтва калгасьнікаў у прамысловасьць. Побач з гэтым на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва вялізарнае палітычна-гаспадарчае значэньне мае далейшае ўкараненьне ў прамысловасьць рабочай сілы.

Дырэктыва СНК БССР аб укараненьні ў прамысловасьць ня менш 40 проц. жаночай працы ў 1931 г. у агульным выканана. Разам з тым неабходна з усёй сілай падкрэсьліць, што па радзе галін прамысловасьці ёсьць яшчэ значнае адставаньне росту жанчын: мэталяапрацоўчай, скурана-абутковай, дрэваапрацоўчай і ў асаблівасьці хэмічнай і керамічнай. Гэта адставаньне перакрываецца ўсімі астатнімі галінамі прамысловасьці, у выніку чаго мы і маем агульнае выкананьне зданьня СНК аб укараненьні жаночай працы.

Сьцьвярджэньне аб тым, што ўкараненьне жаночай працы «сутыкаецца у нас звычайнымі кансэрвацыйнымі і апартуністычнымі ўстаноўкамі аб немагчымасьці ўкараненьня жаночай працы ў цяжкую індустрыю з-за фізіялёгічных асаблівасьцяй работніц, з-за нярэнтабельнасьці жаночай працы» («Рабочай» ад 25/VIII)—бясспрэчна згушчае фарбы. Выкананьне зданьня СНК абвяргае гэту фармулёўку, надзвычай абагульваючую апартуністычныя спробы асобных гаспадарнікаў ігнараваць дырэктыву партыі, ураду і прафсаюзаў аб укараненьні жаночай працы.

Тэорыі асобных гаспадарнікаў аб немажлівасьці ўжываньня жаночай рабочай сілы ня маюць пад сабою ніякай глебы і зьяўляюцца спробай апраўдаць кансэрватызм і апартуністычнае нежаданьне і няўменьне рэалізаваць адну з важнейшых гаспадарча-палітычных задач.

Асобныя выпадкі немажлівасьці ўжываньня жаночай працы на некалькіх працэсах работы ў цяжкой індустрыі (у кавальскім, ліцейным цэхах, пракацце і г. д.) якія прадугледжаны існуючым законадаўствам, ні ў якой меры не супярэчаць агульнаму прынцыповаму палажэньню аб необходнасьці скансцентраваньня агню па задачы фарсаванага ўцягненьня жаночай працы ў цяжкую прамысловасьць, якая зьяўляецца ганебна адстаючым зьвяном у адносінах ўкараненьня жаночай рабочай сілы.

Вуалявым цэнтральным пунктам усёй работы па ўкараненьні жаночай працы на ўвесь бліжэйшы адрэзак часу зьяўляецца **пляванаьне** гэтай работы і жорсткі кантроль над выкананьнем дырэктыў партыі, ураду і прафсаюзаў па гэтым пытаньні.

Неабходна з усёй рэзкасьцю адзначыць, што да гэтага часу ні з боку органаў Наркампрацы, гаспадарнікаў, а таксама часткі прафсаюзаў мы ня маем сыстэматычнай плянавай работы.

На даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва «нельга ўжо разьлічваць па самацёк рабочай сілы», «ад палітыкі самацёку трэба перайсьці да палітыкі арганізаванага набору рабочых для прамысловасьці» (Сталін — з прамовы на канфэрэнцыі гаспадарнікаў).

Органы Наркампрацы і прафсаюзы павінны ў першую чаргу паставіць сабе задачай у мінімальныя тэрміны забясьпечыць цьвёрдую плянавасьць гэтай работы пры настойлівым штодзённым, жорсткім кантролем над выкананьнем пляну ўкараненьня жаночай працы ў прамысловасьць.

Адным з практычных каналаў арганізаванага плянавага ўкараненьня жаночай працы, зьяўляецца практыка атрыманьня жаночай сілы на дагаворных падставах праз ЖАКТы — гэта ўстаноўка прафсаюзаў БССР і органаў Наркампрацы — павінна атрымаць самае шырокае распаўсюджаньне і па справе зьявіцца адным з рашаючых шляхаў атрыманьня жаночай працоўнай сілы для прамысловасьці.

Разам з тым асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на далейшае разгортваньне работы па падрыхтоўцы кваліфікаванай жаночай сілы праз сыстэму навучальных устаноў, курсаў і школ з абавязковым павышэньнем кантынгенту прыёму жанчын, пры масавым, сыстэматычным кантролі за выкананьнем зацьверджаных норм прыёму жанчын.

Другім асноўным момантам у пытаньні ўкараненьня рабочай сілы павінна быць настойлівая работа па кваліфікацыі і перакваліфікацыі жанчын. Ад вырашэньня гэтага пытаньня ў значнай ступені залежыць агульнае вырашэньне праблемы ўкараненьня жаночай працы. Да гэтага часу яшчэ жанчына, якая паступае ў прамысловасьць, з-за зусім незадавальняючай пастаноўкі работы па кваліфікацыі і перакваліфікацыі застаецца на нізкіх кваліфікацыях, яўна слаба прасоўваецца на шляху аўладаньня адказнымі вучасткамі вытворчасьці, што і прыводзіць да агульнага невыстарчальнага ўкараненьня жанчыны ў прамысловасьць.

Трэцяй неабходнай умовай пасьпяховага ўкараненьня жаночай працы ў прамысловасьць зьяўляецца забесьпячэньне жанчыне ўмоў, якія-б дазволілі бяз усякіх перашкод лакінуць хатнюю працу і перайсьці ў вытворчасьць. Пашырэньне сеткі сталовых, пры далейшым значным паляпшэньні іх работы, арганізацыя грамадзкіх пралень, дзіцячых ясьляй, садоў, пляцовак, з поўнай указкай іх працы з штатзьменнасьцю на прадпрыемстве — уся гэта работа па рэконструкцыі быту павінна непарыўна спадарожнічаць агульнай справе ўкараненьня жанчыны ў вытворчасьць, бо якой бы там ні было разьбежкі, памі гэтымі двума зьвеньнямі на сутнасьці адзнай і тэй-жа работы.

Кожнае зьвяно прамысловасьці, кожная фабрыка і завод павінны дэтальна і практычна прапрацаваць пытаньне аб укараненьні жаночай працы ў сваіх канкрэтных умовах, забясьпечыць устанаўленьне масавага рабочага кантролю над гэтай работай.

У сьвятле гэтай задачы неабходна адзначыць надзвычай каштоўны пачын рабочых фабрыкі «Камунарка», якія паставілі справу ўкараненьня жаночай працы сапраўды на прынцыповую вышыню і распрацавалі канкрэтныя самаабавязацельства па гэтым пытаньні («Рабочай» ад 25/III).

Разам з гэтым неабходна падкрэсьліць каштоўнасьць прапановы рабочых «Камунаркі» аб скліканьні нарад трыкутнікаў па пытаньні ўцягненьня жанчын у прамысловасьць і ў самы кароткі тэрмін рэалізаваць гэтую прапанову ў кожным горадзе і раёне, праведзьць дасканалую падрыхтоўчую работу да арганізацыі і скліканьня нарад.

Кожнае зьвяно прафсаюзаў Беларусі павінна падхапіць ініцыятыву «Камунаркі», праламіўшы яе ў канкрэтнай сапраўднасьці свайго прадпрыемства.

Мерапрыемствы ЦСПСБ і Наркампрацы, выпрацаваныя на Усебеларускай нарадзе па пытаньнях працы, пастановы XI пленуму ЦСПСБ па пытаньнях ўкараненьня жаночай рабочай сілы павінны вычарпальныя ўстаноўкі ў вырашэньні гэтай адказнай палітыка-гаспадарчай задачы.

Рэалізацыя гэтых дырэктыў ЦСПСБ і Наркампрацы, асваеньне пачыну «Камунаркі» павінна зьявіцца неадкладнай баявой задачай органаў Наркампрацы, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый пры падтрыманьні шырокай рабочай грамадзкасьці і ўстанаўленьні выразнага сыстэматычнай праверкі выкананьня плянаў і дырэктыў аб укараненьні жанчын у прамысловасьць.

Пры гэтай умове, адна з важнейшых задач «работы па-новаму» — спрэчкі ўкараненьня жаночай працы ў вытворчасьць — будзе выканана, тым самым спрыяючы выкананьню і перавыкананьню плянаў першай пяцігодкі і падрыхтоўцы да рэалізацыі другога пяцігодзьдзя плану сацыялістычнага будаўніцтва.

СЭКТАР КАДРАЎ ЦСПСБ.

Паведамленьні

— 16-IX-31 г., у 6 гадз. веч., у памяшк. аб'яднанага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ БССР (Савецкая, 55, 1-шы паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ з разглядам наступных спраў: 1) Справа загадчыка Парыцкай Райапчадкасы, 2) Справа інжынэра Шклоаб'яднаньня тав. Катана, 3) Справа Белшклоаб'яднаньня, 4) Справа Скарынца Рытога, 5) Справа настаўніцы Кожавай, 6) Справа нач. выт ворчай часткі ткацкага цэху «Гомтэкстыль» т. Ліваранта. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца Выклікаюцца рабочыя засядацелі т. т. Іваноў, Гольдбэрг, Кажура—пута «Пралетары», Фрыдман, Пітэйнгард, Пятровіч, Жабрынскі — зав. «Бальшавік», Вабрук, Янчук, Буран—Хлебазавод. Запрашаюцца ахтыў, «ЛК» і рабкоры.

— Беларуская асоцыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў «БелАПП» і Беларуская дзяржаўная студыя оперы і балету абвяшчаюць, што 16 верасьня, у 8 гадз. веч., у памяшк. Дому Пісьменьніка адбудзецца чытка лібрэта па тэме «Сталінстан» аўтараў т. т. Ладнага, Брадоцкага. Запрашаюцца т. т. Чарнышэвіч (ЦК КП(б)Б), Клімковіч (ЦСПС), Канакоцін і Сорбэта (Гісьпарт), Гурскі і Любень (Галоўмастацтва), Дунец (газ. «Акцябр»), Бронштэйн (ВДУ), Векраціэвіч (ВДВ), Платуа і Бялуга (НКАсьветы), Казальчук і Міровіч (Гаркам КП(б)Б), Папоў, Такарчук і Самуцін (рэд. газ. «Зьвязда»), Дайн і Сьпешны (газ. «Рабочай»), Платаў (газ. «Чырв. Зьмена»), Адамсон (газ. «Сав. Бел»), Казакоў і Прыс (музтэхнікум), Рцэвіч (ЦК ЛКСМБ). Таксама запрашаюцца пісьменьнікі, мастакі, кампазытары, драматургі, літгуртковцы, настаўнікі і студыйны склад студыі і музтэхнікуму, акторы ўсіх дзяржаўных тэатраў, якія знаходзяцца зараз у Менску.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Менск, друкарня «Зьвязды».

Галоўлітбел 337